ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СНЕЖНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 234 (28092) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Дзяўчына з байцоўскім характарам**

**Цераз церні ўбачыць даўнішняе**

**Як стаць эльфам 80-га ўзроўню?**

*ЦЫТАТА ДНЯ*

**Леанід ГУЛЯКА, Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей:**

*«Грамадская згода — гэта бясцэннае духоўнае багацце Беларусі, таму, нягледзячы на ўсе нашы сённяшнія складанасці, прадстаўнікі розных народаў, прыхільнікі розных канфесій павінны быць і ў будучыні забяспечаны камфортнымі ўмовамі ў нашай дзяржаве. У краіне не выяўлена дзейнасць радыкальных рэлігійных арганізацый і іх прадстаўнікоў. У сувязі з гэтым грамадскае меркаванне ў дачыненні да ўсіх рэлігійных арганізацый застаецца пазітыўным».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.12.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 18085,00 | ▲ |
| Еўра | 19204,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 271,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 758,28 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X



# «РЫБНЫ ДЗЕНЬ»

**Мінчанам даўно палюбіліся рыбныя кірмашы, якія рэгулярна праходзяць у розных раёнах сталіцы. Адзін з іх быў арганізаваны днямі ў Маскоўскім раёне. Сваю прадукцыю тут прадставілі айчынныя рыбаводчыя арганізацыі — прычым па цэнах ад вытворцаў. «Рыбны дзень» удаўся на славу!**

Фота БЕЛТА.

# РОЎНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

**Інваліднасць — гэта, верагодна, лёс. З ёю ў свеце жыве прыкладна адзін мільярд людзей — гэта каля 15% ад усяго насельніцтва планеты. У нашай краіне людзей з інваліднасцю — больш за паўмільёна. Звычайна яны з удзячнасцю прымаюць дапамогу, але не любяць і не прымаюць шкадавання. «Мы такія ж, як і ўсе іншыя», — сцвярджаюць яны. І мараць быць на роўных са здаровымі: працаваць, быць карыснымі, а задача грамадства — падтрымаць іх. Менавіта на гэта і скіравана сацыяльная палітыка ўсіх дзяржаў свету, у тым ліку і нашай.**

СТАР. 4

Фота Анатоля КЛЕПЧУКА.

■ Фінансавыя тэхналогіі

# БАНКІ САРЫЕНТУЮЦЬ НА «ЛІЧБУ»

**Эксперты Нацбанка ўпэўнены, што новая сістэма ідэнтыфікацыі кліентаў павялічыць канкурэнцыю ў фінансавай сферы і знізіць кошт банкаўскіх паслуг і прадуктаў**

**Налета ў кастрычніку ў нашай краіне пачне сваё функцыянаванне міжбанкаўская сістэма ідэнтыфікацыі (МСІ), стварэнне якой прадугледжана Указам кіраўніка дзяржавы ад 1 снежня 2015 года № 478 «Аб развіцці лічбавых банкаўскіх тэхналогій». З пачаткам працы МСІ ў краіне будуць створаны ўмовы для развіцця лічбавай трансфармацыі банкаўскага сектара, пра што паведамляе прэс-служба Нацыянальнага банка Беларусі.**

## АДЗІНЫ «ФЭЙС-КАНТРОЛЬ» ДЛЯ КЛІЕНТАЎ

Зразумела, што ўкараненне найноўшых лічбавых тэхналогій у банкаўскай сферы — агульнасусветны трэнд, які падтрымліваецца і айчыннымі банкамі. Таму сёння ў свеце ўсё больш банкаўскіх паслуг аказваюцца пры дапамозе дыстанцыйных каналаў і далейшая лічбавая трансфармацыя магчыма толькі з рашэннем пытання па міжбанкаўскай ідэнтыфікацыі кліентаў. Спецыялісты рэгулятара адзначаюць, што менавіта яе адсутнасць з'яўляецца асноўным бар'ерам на шляху доступу фізічных і юрыдычных асоб (кліентаў) да банкаўскіх паслуг і прадуктаў з дапамогай дыстанцыйных (лічбавых) каналаў узаемадзеяння.

Эксперты фінансавай сферы ўпэўнены, што фарміраванне МСІ дазволіць кліентам банкаў, аднойчы прайшоўшы працэдуру ідэнтыфікацыі асабіста ў адным з банкаў, атрымліваць банкаўскае абслугоўванне з дапамогай дыстанцыйных каналаў у любым беларускім банку ў зручны час. Такім чынам, цяпер жыхарам нашай краіны стануць даступны паслугі, якія аказваюцца беларускімі банкамі, незалежна ад наяўнасці ў іх населеных пунктах аддзяленняў банкаў.

## БАНКАЎСКІЯ ПАСЛУГІ — НЕ ВЫХОДЗЯЧЫ З ДОМУ

«У якасці тэхналагічнай базы для фарміравання МСІ выступае адзіная разліковая і інфармацыйная прастора Рэспублікі Беларусь (АРІП)», — гаворыцца ў паведамленні Нацбанка. Спецыялістамі рэгулятара ўдакладняецца, што адначасова з прыняццем указа №478 будзе ўдасканалены механізм аказання банкамі паслуг і ажыццяўлення банкаўскіх аперацый.

СТАР. 2

■ Духоўны скарб

# ДЫЯЛОГ ПАМІЖ ЦАРКВОЙ І ГРАМАДСТВАМ

## умацавалі чытаннямі

**У Мінску прайшлі першыя беларускія Калядныя чытанні, арганізаваныя Беларускай праваслаўнай царквой.**

Такога кшталту мерапрыемствы час ад часу праводзіліся ў беларускіх епархіях, але былі лакальнымі. Гэтым разам можна казаць пра стварэнне буйной пляцоўкі для абмеркавання надзённых праблем паміж БПЦ і свецкімі асобамі.

Чытанні прысвяцілі аднаўленню спрадвечных, традыцыйных каштоўнасцей праз вывучэнне мінулага. А менавіта — тысячагоддзю спачыну святога роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Святары, выкладчыкі і кіраўнікі беларускіх універсітэтаў, дзіцячых садкоў і школ, прадстаўнікі міністэрстваў, пісьменнікі, парламентарыі, медыкі, навукоўцы і навучэнцы сабраліся разам, каб падзяліцца сваім бачаннем таго, як развіваецца беларускае грамадства ў культуры, медыцыне, сацыяльнай сферы і адукацыі.

— Калядныя чытанні праводзіліся шмат разоў, — расказвае **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі.** — У нас адбываюцца першыя агульнабеларускія. Яны будуць апярэджваць тыя, што маюць адбыцца ў Маскве. Мы выконваем бласлаўленне Найсвяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла, які з'яўляецца генератарам такога кшталту ідэй. Ён пастаянна прапаноўвае нам нешта новае, што можа аб'яднаць людзей.

Чаму менавіта такой тэме прысвечаны форум? Уладыка падкрэсліў: «Сёння мы будзем казаць пра князя Уладзіміра. Пра цывілізацыю, якую прынесла на нашу блаславёную зямлю праваслаўнае веравучэнне. Зараз важна нашых дзяцей, маладое пакаленне далучаць да традыцыйнай культуры, гісторыі, духоўных каштоўнасцей, якімі жылі многія пакаленні беларусаў».

Звяртаючыся да прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі, Мітрапаліт звярнуў увагу на тое, што важна абараніць людзей ад страсцей, якія спрадвечна ахопліваюць кожнага. І пэўную ролю ў гэтым могуць адыграць менавіта СМІ. «Зараз свецкая прэса падштурхоўвае людзей засяроджвацца толькі на зямным жыцці, забываючы, што жыццё тут — толькі часовая з'ява. Вядома, мы павінны дастойна жыць: Царква гэта не асуджае. Але яна заклікае, каб у гэтым жыцці мы ўдасканальваліся, станавіліся больш добрымі і чыстымі. Каб мы сталі святымі. Гэты духоўны багаж кожны мусіць забраць у іншы свет, — такую думку выказаў Уладыка і дадаў: — Спадзяюся, чытанні будуць садзейнічаць праяўленню найлепшых якасцей у чалавеку».

Алена Радчанка, намеснік Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей, выказала меркаванне, што ў сучасных умовах узаемадзеянне царквы і дзяржавы з'яўляецца складнікам сацыяльнай стабільнасці, спрыяе захаванню самабытных рыс, нацыянальных традыцый беларускага народа.

Чытанні аб'ядналі канферэнцыю, круглыя сталы, секцыйныя пасяджэнні. Падчас іх абмеркавалі супрацоўніцтва Беларускай праваслаўнай царквы з дзяржавай і грамадскасцю ў сферы культуры, маладзёжнай палітыкі, адукацыі, навукі і аднаўлення сямейных каштоўнасцей.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Міжнародная канферэнцыя

# ДЗЕЛЯ ГАРМАНІЧНАГА СВЕТУ

## Навуковая і творчая інтэлігенцыя трох краін сабралася ў Мінску

**Наша сталіца, памятаючы свой вопыт арганізацыі перамоў у «нармандскім фармаце» і застаючыся мірнай пляцоўкай для міжнародных мерапрыемстваў, сабрала ўчора прадстаўнікоў Расіі, Украіны і ўласна Беларусі на навукова-практычную канферэнцыю «Навука і культура ў сучасным дыскурсе».**

Арганізатары мерапрыемства з беларускага боку, сярод якіх Міністэрства інфармацыі і Нацыянальная акадэмія навук, адзначаюць статус краіны як прызнанага цэнтра перамоўнага працэсу ў рэгіёне Усходняй Еўропы, таму недарэмна менавіта Мінск сабраў прадстаўнікоў навуковай і творчай інтэлігенцыі трох дзяржаў.

«У час, калі ў свеце і на постсавецкай прасторы адбываюцца жахлівыя працэсы, нам, як ніколі, важна мець магчымасці і жаданне знаходзіць тэмы для дыскурсу і генераваць новыя ідэі, — сказала, вітаючы ўдзельнікаў навукова-практычнай канферэнцыі, **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ.** — Мы пачыналі год з вялікага гуманітарнага праекта — Міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, на пляцоўках якой пісьменнікі розных краін абмяркоўвалі актуальныя для літаратурнага свету пытанні, а ў гэты ж час у Палацы Незалежнасці ішлі перамовы ў «нармандскім фармаце». Беларусь імкнецца да добрых узаемаадносін не толькі з дзяржавамі былога СССР, мы працягваем руку дабра і міру ўсім краінам. Сваёй палітыкай і практычнымі крокамі мы робім усё, каб будучыя пакаленні маглі будаваць новы свет без войнаў і канфліктаў».

Праграма канферэнцыі была падзелена на блокі па тэмах. Але выступленні прайшлі ў свабодным фармаце. Адзін з запрошаных гасцей, **спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл ШВЫДКОЙ**, у першую чаргу адзначыў... дранікі, якія яму давялося паспытаць за дзень да канферэнцыі, і сказаў, што хаця б толькі дзеля іх варта было прыязджаць. Ён, дарэчы, выступіў суініцыятарам гэтай канферэнцыі і падчас пленарнага пасяджэння простым імправізаваным прыкладам адлюстраваў зменны ў свядомасці грамадства. Узгадваючы словы Ліліі Ананіч, якая анансавала будучае важнае свята 2017 года — пяцісотгоддзе беларускага кнігадрукавання — Міхаіл Швыдкой спытаў: «А які юбілей мы назвалі б самым важным гадоў дваццаць пяць таму, зыходзячы з уласцівага нам тады светаўспрымання?» І сам жа адказаў: «Перамогу сацыялізму, вядома ж».

Больш за пяцьдзясят удзельнікаў, сярод якіх акадэмікі, палітолагі, выдаўцы, журналісты, эксперты ў розных галінах, кіраўнікі ВНУ, абмеркавалі агульнае мінулае і нашу будучыню.

Учора ж удзельнікі трохбаковай сустрэчы дзеячаў навукі і культуры Беларусі, Расіі, Украіны заснавалі «Мінскую ініцыятыву» — комплексны беларуска-расійска-ўкраінскі праект, скіраваны на актывізацыю навуковай і культурнай дзейнасці ў кожнай з краін і ў агульнай духоўнай прасторы праз напаўненне новым сэнсам трохбаковага і шматбаковага супрацоўніцтва.

— У сённяшняй канферэнцыі бралі ўдзел дзеячы навукі, культуры і мастацтва трох дзяржаў: Беларусі, Расіі і Украіны. Нацыянальныя эліты разумеюць: менавіта Беларусь можа стаць пляцоўкай не толькі для палітычнага, але і для гуманітарнага супрацоўніцтва, бо мы не маем праблем у адносінах ні з Расіяй, ні з Украінай. У той жа час градус дыялогу паміж расійскім і ўкраінскім народамі цяпер нярэдка, што называецца, «зашкальвае». Менавіта Беларусь сёння ініцыявала праект пад назвай «Мінская ініцыятыва», каб знайсці форму для трохбаковых кантактаў і сяброўскага супрацоўніцтва дзеячаў навукі, культуры, СМІ. Мы ўпэўнены, што нават самыя балючыя раны загояцца і трэба ўжо сёння, не адкладваючы на потым, іх лячыць, — адзначыла Лілія Ананіч. — Таму «Мінская ініцыятыва» — гэта не проста дыскусійны клуб. Неўзабаве з'явяцца самыя розныя пляцоўкі — культурныя, навуковыя, інфармацыйныя, дзе будуць генерыравацца тыя праекты, якія дапамогуць будаваць гарманічны свет.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** *katsyalovich@zviazda.by*

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

# БАНКІ САРЫЕНТУЮЦЬ НА «ЛІЧБУ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Таму нараўне з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу кліент зможа атрымаць банкаўскую паслугу пры дапамозе праграмна-тэхнічных сродкаў і тэхналогій на базе інфармацыі аб першаснай ідэнтыфікацыі без неабходнасці наведвання банкаў. Такое абслугоўванне кліентаў будзе ажыццяўляцца з улікам рызыка-арыентаванага падыходу пры выкананні кожнай канкрэтнай банкаўскай аперацыі.

## РАЗЛІКІ «ФІЗІКАЎ» — ПРАЗ АРІП

Акрамя таго, гэтым дакументам прадугледжваецца, што «з 1 студзеня 2017 года ўсе юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія ажыццяўляюць работы, рэалізуюць тавары (паслугі) і карыстаюцца паслугамі банкаў і іншых юрыдычных асоб для арганізацыі прыёму плацяжоў на іх карысць, а таксама інтэрнэт-крамы павінны даць магчымасць фізічным асобам праводзіць названыя плацяжы з дапамогай АРІП». Такім чынам, насельніцтву будзе забяспечана магчымасць аплаты работ, тавараў і паслуг у больш чым 13 тысячах пунктах прыёму плацяжоў, у тым ліку і з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання, банкаматах і інфакіёсках.

Цяпер менавіта Нацбанк адказвае за фарміраванне і развіццё АРІП, забяспечвае функцыянаванне яго аўтаматызаванай сістэмы АІС «Разлік», а таксама ажыццяўляе нарматыўнае прававое рэгуляванне і метадалагічнае забеспячэнне працэсу прыёму плацяжоў за паслугі і ў бюджэт ад насельніцтва. Аднак такая дзейнасць не адносіцца да кампетэнцыі цэнтральнага банка краіны як дзяржаўнага органа і не адпавядае міжнароднай практыцы.

Таму адным з эфектыўных механізмаў вызвалення цэнтральнага банка ад выканання неўласцівай функцыі выступае стварэнне самастойнага суб'екта гаспадарання з яго удзелам. У сувязі з гэтым указам № 478 прадугледжана стварэнне адкрытага акцыянернага таварыства «Нябанкаўская крэдытна-фінансавая арганізацыя «Адзіная разліковая і інфармацыйная прастора», якое павінна пачаць сваю самастойную дзейнасць налета з 1 красавіка.

Ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Набанка ўпэўнены, што выкананне нормаў гэтага ўказа паслужыць дадатковым стымулам для павелічэння колькасці карыстальнікаў банкаўскімі паслугамі, а таксама паспрыяе зніжэнню цэн банкаўскіх паслуг і прадуктаў за кошт росту канкурэнцыі і скарачэння выдаткаў банкаў на іх аказанне.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ВЫРАШЫЦЬ ПРАБЛЕМУ ПА ТЭЛЕФОНЕ

## У КРАІНЕ ПРАЦЯГВАЮЦЦА «ПРАМЫЯ ЛІНІІ»

Такі від сувязі ўлады з жыхарамі розных рэгіёнаў працуе ўжо каля года. Штотыднёвае правядзенне аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам прамых тэлефонных ліній наладжана ў мэтах павышэння эфектыўнасці работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.

***У гэтую суботу, 5 снежня, на прамыя тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 выйдуць:***

**Брэсцкі аблвыканкам**

намеснік старшыні КЛЕЦ Андрэй Анатольевіч (80162213121),

**Віцебскі аблвыканкам**

намеснік старшыні ДЗЯМ'ЯНАЎ Эдуард Міхайлавіч (80212204260),

**Гомельскі аблвыканкам**

старшыня абласнога Савета дэпутатаў БАРЫСЕНКА Алег Леанідавіч (80232751237),

**Гродзенскі аблвыканкам**

кіраўнік справамі ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644),

**Мінскі аблвыканкам**

старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160),

**Магілёўскі аблвыканкам**

намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869),

**Мінскі гарвыканкам**

намеснік старшыні ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

■ Кропкі над «і»

# ДЗЕДА МАРОЗА НЕ ЗАБАРАНЯЛІ!

**Ніякіх забарон на запрашэнне ва ўстановы адукацыі артыстаў, якія могуць дапамагчы правесці навагоднія мерапрыемствы і стварыць святочны настрой, Міністэрства адукацыі не ініцыявала. У гэтым журналіста «Звязды» запэўніў міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ.**

— Мы нават не ведаем, каму належыць ідэя шукаць Дзедаў Марозаў ва ўласных калектывах, — канстатаваў кіраўнік ведамства. — Добра, вядома, калі ў асяродку педагогаў ёсць артыстычныя таленты або калі сярод бацькоў школьнікаў і выхаванцаў дзіцячых садкоў знойдуцца ахвотныя стаць казачным персанажам. А калі такіх адважных няма? Верагодна, гэтая ініцыятыва ішла не «зверху», а «знізу». Магчыма, нават з мэтай абароны сем'яў, якія не могуць выдаткаваць на свята вялікія грошы...

У любым выпадку прымаць рашэнне — наймаць ці не наймаць для правядзення навагодніх мерапрыемстваў артыстаў або аніматараў — павінны самі бацькі, зыходзячы са сваіх фінансавых магчымасцей. Папячыцельскі савет або бацькоўскі камітэт могуць разам з адміністрацыяй установы адукацыі вырашыць, як зрабіць больш правільна, каб улічыць інтарэсы ўсіх.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ЧЫМ ЗАЦІКАВІЦЬ ІНВЕСТАРАЎ?

**Дваццаць беларускіх праектаў будуць прадстаўлены на пітч-сесіі фонду «Сколкава» падчас першага Еўразійскага форуму маладых навукоўцаў, які праходзіць гэтымі днямі ў беларускай сталіцы.**

— Усе яны на конкурснай аснове прэтэндуюць на атрыманне фінансавання, — патлумачыў **старшыня Савета маладых навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй ІВАНЕЦ.** — Прадстаўнікі «Сколкава» будуць праводзіць конкурсны адбор, а таксама дадуць рэкамендацыі, каб максімальная колькасць праектаў атрымала падтрымку.

«У нас вельмі дынамічна развіваецца супрацоўніцтва з інавацыйным цэнтрам «Сколкава», мы пастаянна ўдзельнічаем у іх мерапрыемствах», — канстатаваў Андрэй Іванец.

Першы Еўразійскі форум маладых навукоўцаў быў ініцыяваны Саветам маладых навукоўцаў НАН Беларусі і падтрыманы ўсёй вучонай моладдзю краін ЕАЭС. Форум будзе праходзіць раз у два гады і мяняць сваю «дыслакацыю». Удзел у ім бяруць каля 500 чалавек, у тым ліку з Расіі, Казахстана, Арменіі, Турцыі, Германіі і іншых краін. Падчас форуму будуць прадстаўлены дасягненні ў розных галінах — ад аховы навакольнага асяроддзя да медыцыны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## БУСЕЛ НА ДАХУ

**На дах аднаго з дзіцячых садкоў Брэста прыляцеў бусел, уладкаваўся там і з задавальненнем прымае пачастунак.**

Дзеці любяць назіраць за птушкай. А дарослыя звярнуліся з пытаннямі да спецыялістаў, чаму ж гэтая птушка ў вызначаны час не паляцела ў цёплыя краіны. Адны выказалі здагадку, што бусел з прычыны траўмы не адчувае ў сабе сілы на вялікую дарогу, іншыя лічаць, што белы птах вырас на прыватным падворку і не ўмее сябе паводзіць у жывой прыродзе. Выхаванцы садка вельмі рады госцю. А можа, ён тут у якасці знака для бацькоў гэтых дзетак? Маўляў, гатовы прынесці ім брацікаў альбо сястрычак...

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Кампетэнтна

# «АМНІСТЫЯ НЕ ПАЎПЛЫВАЛА НА КРЫМІНАГЕННУЮ СІТУАЦЫЮ Ў КРАІНЕ»

**Напрыканцы лістапада праваахоўныя органы паставілі кропку ў рэалізацыі амністыі ў сувязі з 70-годдзем Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Усяго вызвалена 1834 асуджаныя, 95 з іх — жанчыны. На год тэрмін пакарання скарочаны 2150 зняволеным. З выпраўленчых установаў адкрытага тыпу на волю выйшлі 685 чалавек. Пра гэта журналістам паведаміла Жанна БАТУРЫЦКАЯ, начальнік упраўлення выканання прысудаў Дэпартамента выканання пакаранняў МУС РБ.**

— Закон аб амністыі закрануў тых, каго, як правіла, асудзілі ўпершыню, хто ўчыніў злачынствы супраць маёмасці, якія не ўяўляюць вялікую небяспеку для грамадства, — кажа Жанна Батурыцкая. — Гэтыя асуджаныя характарызаваліся пазітыўна, добра сябе паводзілі і цалкам пакрылі ўрон за зробленыя злачынствы, што было абавязковай умовай.

Як запэўніла суразмоўніца, амністыя не выклікала росту злачынстваў і не паўплывала на крымінагенную абстаноўку ў Беларусі. Адметна, што ўжо некалькі гадоў запар памілаванне не распаўсюджваецца на тых, хто кіраваў аўтамабілем у нецвярозым стане альбо звязаны з распаўсюджваннем наркотыкаў.

***— А як будзе праходзіць рэабілітацыя былых асуджаных?***

— Па ўсіх вызваленых інфармацыя накіроўваецца ў тэрытарыяльныя органы ўнутраных спраў. Іх паставяць на прафілактычны ўлік, і яны пастаянна будуць знаходзіцца ў полі зроку супрацоўнікаў міліцыі, — адзначыла Жанна Батурыцкая.

Варта дадаць, што падчас амністыі зняволеныя пакрылі ўрон на суму 15,7 мільярда рублёў. Дзякуючы гэтаму пацярпелыя атрымалі звыш Br3,15 мільярда.

**Тарас ШЧЫРЫ.**
*taras@zviazda.by*

■

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «АВАРЫЙНАЯ БРЫГАДА ЎЖО ВЫЕХАЛА»

**З вёскі Галынка Клецкага раёна на «гарачую лінію» нашай газеты патэлефанавала Валянціна Мікалаеўна Васілевіч, якая ад імя сваёй суседкі-пенсіянеркі па вуліцы Садовай Тамары Іванаўны Іванейчык выклала наступную праблему. Паводле слоў заяўніцы, побач з домам апошняй знаходзіцца водаправодная калонка, якая працякае: вельмі моцна і даўно. «Вада бяжыць ручаём». З-за такога становішча дом спадарыні Іванейчык падтоплівае. Як расказала Валянціна Мікалаеўна, куды толькі з гэтай нагоды не звярталіся: і ў сельскі выканкам, і ў мясцовую ЖКГ апошні раз падавалі заяўку на рамонт яшчэ ў верасні, але сітуацыя не змянілася... Забягаючы наперад, зазначым, што гэтая гісторыя аказалася трохі заблытанай, але, спадзяёмся, у ёй будуць зрухі, што прывядуць да выпраўлення становішча і задаволяць усе бакі.**

Напачатку па даручэнні галоўнага інжынера КУП «Клецкая ЖКГ» Юрыя Ярашэвіча з рэдакцыяй звязаўся намеснік **дырэктара па вадзе і каналізацыі Аляксей ДАШКЕВІЧ.** Ён паведаміў, што згаданая калонка, як і сам водаправод, не знаходзіцца на балансе прадпрыемства. Свідравіна размешчана на мехдвары мясцовай гаспадаркі СВК «Звонка», вадой карыстаюцца і вяскоўцы. Заявак на рамонт ад жыхароў вуліцы Садовай, па словах Аляксея Сяргеевіча, не паступала.

— Хоць мы можам выканаць любы від работ, дастаткова толькі даслаць нам пісьмо з гарантыяй аплаты. Прафілактычныя работы калонкі абыдуцца прыкладна ў 300 тысяч рублёў плюс транспартныя выдаткі. Гэта калі не патрабуецца больш сур'ёзнага ўмяшання кшталту замены труб, — распавёў суразмоўца.

**Старшыня Галынкаўскага сельскага выканкама Мікалай БУЙВІЛА** ў тэлефоннай гутарцы расказаў такую гісторыю. На падворку суседкі заяўніцы ёсць калодзеж, і асаблівай патрэбы ў карыстанні калонкай у яе відавочна няма. Сама ж Васілевіч засялілася ў пустуючы дом з паўгода таму. Магчыма, ёй з нейкай прычыны нязручна браць ваду з суседскага калодзежа?

— А праблема з калонкай была і ёсць, — патлумачыў далей Мікалай Васільевіч. — Справа ў тым, што такія калонкі былі некалі прывезены з Прыбалтыкі. Запчастак да іх няма, рамонту яны не падлягаюць і патрабуюць замены. На новую трэба каля трох мільёнаў рублёў. А знаходзяцца такія калонкі на балансе мясцовай гаспадаркі, у якой зараз замежнае прадпрыемства арандуе зямлю і вытворчыя збудаванні. СВК «Звонка» бярэ плату за ваду з карыстальнікаў, таму, відавочна, трэба звяртацца да яго кіраўніцтва.

— Сапраўды, мы бяром плату за ваду з вяскоўцаў, таму і праблему павінны дапамагчы вырашыць, — пацвердзіў **старшыня гаспадаркі Віктар ЛАБКО.** — З месяц таму я асабіста завозіў заяўку ў ЖКГ з трыма адрасамі, у тым ліку там была пазначана і калонка па вуліцы Садовай. Аплату мы гарантуем пасля падпісання акта выкананых работ. Я размаўляў з Аляксеем Сяргеевічам Дашкевічам, ён абяцаў адправіць на месца брыгаду рамонтнікаў.

…Згаданую заяўку ў Клецкае ЖКГ, па словах намесніка дырэктара па вадзе і каналізацыі Аляксея Дашкевіча, з якім мы зноў стэлефанаваліся, так і не знайшлі. Нехта быў у адпачынку, нехта камусьці штосьці павінен быў перадаць... Тым не менш, як запэўніў суразмоўца, у Галынку сапраўды ўжо накіравана аварыйная брыгада.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Сталічнае жыллё

# ЗІМОВАЕ ПАЛЯВАННЕ НА КВАТЭРЫ БЕЗ РАМОНТУ

**У Мінску, як сведчыць аналіз рынку нерухомасці, з пачатку года прыкметна знізіліся цэны на гатовыя кватэры без адстройвання — іх купляюць на 15-20% танней за жыллё з гатовым інтэр'ерам, а для правядзення рамонту ўсё часцей прыцягваюць спажывецкія крэдыты.**

## Дэльта паміж катэгорыямі кватэр — 300 долараў за «квадрат»

Спецыялісты адзначаюць, што сталічнае жыллё з пачатку года патаннела на чвэрць. Найбольшым попытам сталі карыстацца недарагія аб'екты з адным-двума пакоямі. Сярод іх — кватэры без рамонту ў панэльных новабудоўлях і жыллё ў непрывабным стане ў старых дамах. Іх уладальнікам прыходзіцца дэмпінгаваць — кошт «квадрата» ў такіх аб'ектах звычайна ніжэйшы адразу на 300 долараў рэальных цэннікаў. Рыначныя цэны на кватэры без адстройвання ў Мінску цяпер складаюць каля 1100 долараў за квадратны метр, а з рамонтам дасягаюць 1400 долараў за «квадрат».

Разам з тым эксперты другаснага рынку нерухомасці галоўнага мегаполіса краіны адзначаюць, што нават сціплае адстройванне стандартнай кватэры цяпер выльецца ў 100-200 долараў за квадратны метр. Грошы на рамонт усё часцей бяруць у банкаў, якія актывізаваліся ў перадднавагодні перыяд. Многія сем'і скарысталіся крэдытнымі канікуламі — беспрацэнтнай адтэрміноўкай плацяжоў па крэдыце гатоўкай, у тым ліку і на рамонт кватэры.

## Крэдытныя бонусы ад банкаў

Напрыклад, у прэс-службе Альфа-Банка нам паведамілі, што гэтай восенню жыхары краіны пачалі часцей прыцягваць спажывецкія крэдыты для ўладкавання кватэры. Фінансісты ад банкаўскай сферы лічаць, што цяпер час для гэтага самы ўдалы: у снежні, калі традыцыйна ўзмацняецца актыўнасць на рынку жылля, банкі робяць перадднавагоднія паслабленні. У якасці прыкладу — крэдытныя вакацыі ад Альфа-Банка. Многія выкарыстоўваюць гэтую магчымасць, каб хутка зрабіць хоць бы мінімальны рамонт у кватэры і адсвяткаваць навасэлле да канца года.

**Рыначныя цэны на кватэры без адстройвання ў Мінску цяпер складаюць каля 1100 долараў за квадратны метр, а з рамонтам дасягаюць 1400 долараў за «квадрат».**

Попыт на кватэры без рамонту застаецца высокім. «Пакупнік з невялікімі зберажэннямі — у раёне 40 тысяч долараў — цяпер можа сабе дазволіць купіць жыллё ў сталіцы, хоць яшчэ год таму гэта здавалася фантастыкай. Так што цікавасць да такіх прапаноў не зніжаецца. У той жа час трэба разумець, што попыт тут абумоўлены толькі нізкай цаной — варта яе павысіць, як пакупнік пераключыцца на аналагічныя аб'екты, але з гатовым інтэр'ерам», — адзначыла **намеснік дырэктара па продажах на другасным рынку жылля групы кампаній «Твая сталіца» Святлана КУДЗЕЛКА.**

Кватэры ў дрэнным стане папулярныя сёння як сярод маладых мінчан, так і прыезджых. «На рынак прыйшлі новыя пакупнікі, якія раней нават і не марылі пра кватэру ў сталіцы. Некаторыя набываюць недарагія кватэры без рамонту, а потым з дапамогай бацькоў, сяброў або банка робяць рамонт і пераязджаюць, абы не плаціць за арэнду здымнага жылля», — патлумачыла эксперт.

## Сучасны абмен з даплатай

Яшчэ адна тэндэнцыя на рынку — продаж старой кватэры наўзамен новабудоўлі. На жыллёвым рынку, дзе назіраецца патанненне нерухомасці і не хапае жывых грошай, скарачаецца дэльта паміж цаной новай кватэры і коштам старога жылля, а сярод насельніцтва павялічыўся попыт на значныя сумы пазык. «Сярэдні чэк па крэдытах наяўнымі грашыма традыцыйна вагаецца на ўзроўні каля 30 млн рублёў. Але, верагодна, у сувязі з апошнімі тэндэнцыямі на рынку нерухомасці вырас попыт на значныя сумы — да 150-200 млн рублёў, якія можна атрымаць без прыцягнення паручыцеляў», — растлумачылі ў камерцыйным банку.

Менавіта таму ўсё больш сем'яў сталіцы імкнуцца пераехаць у кватэры з сучаснай планіроўкай, вялікай плошчай і высокімі столямі. Вяртаецца цікавасць да схемы трэйд-ін на рынку жылля, хоць большасць забудоўшчыкаў да яе не гатовыя — у такіх выпадках усё роўна даводзіцца фарміраваць «ланцужок» з дапамогай агенцтва нерухомасці. Увогуле схема трэйд-ін прадугледжвае будаўніцтва (набыццё) кватэры пад гарантыю (заклад) старога жылога памяшкання.

## Інвестары ўжо «ўбачылі» цэнавае дно

На сталічным рынку стала больш інвестараў — тыя, хто купляюць нерухомасць з мэтай укладання зберажэнняў. Нягледзячы на тое, што цэны на жыллё працягваюць зніжацца, у сярэднетэрміновай перспектыве аб'екты нерухомасці могуць прынесці пэўную прыбытковасць. Часцей за ўсё кватэры купляюць беларусы, але нерухомасцю ў Мінску цяпер пачалі цікавіцца і расіяне з грашыма.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■

## Патаннелымі мінскімі кватэрамі зноў пачалі цікавіцца расійскія таўстасумы

■ Надвор'е

# Уначы на Новы год чакаецца невялікі снег і слабы мароз

А ў першы дзень наступнага года сіноптыкі абяцаюць каля нуля

**Гэты снежань абяцае быць цяплейшым, чым у сярэднім за мінулыя гады. Аб гэтым паведаміў на брыфінгу «Надвор'е зімы 2015/16» начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У першую дэкаду месяца будзе ўвогуле не па-зімоваму цёпла. Так, ужо ў пятніцу праз тэрыторыю краіны будзе праходзіць атмасферны фронт, таму ў паўночных і цэнтральных раёнах чакаюцца кароткачасовыя ападкі — дождж і мокры снег. Па паўночным захадзе прагназуецца вецер з парывамі да 15-20 м/с, туман, на дарогах галалёдзіца. І ў найбліжэйшыя выхадныя надвор'е істотна не зменіцца, нават крыху пацяплее. У суботу і нядзелю ўначы будзе ад нуля да плюс 5 градусаў. Удзень чакаецца ўвогуле 2-8 цяпла. Да канца дэкады надвор'е будзе такім. Нягледзячы на адносную цеплыню, на вуліцы будзе сыра, ветрана і таму дыскамфортна.

Не вельмі істотна палепшыцца надвор'е і ў другой дэкадзе месяца. У асобныя дні чакаюцца кароткачасовыя ападкі — мокры снег, які будзе пераходзіць у дождж. Месцамі прагназуецца галалёд і галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да мінус 5 градусаў, па паўднёвым захадзе — 1-3 цяпла. У трэцяй дэкадзе снежня часам чакаюцца ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу, на дарогах будзе галалёдзіца. Тэмпература ўначы складзе 2-10 марозу, пры праясненнях — да мінус 10-14 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 4 да плюс 3 градусаў, у асобныя дні прагназуецца 5-8 марозу, але ўвогуле снежань будзе цёплым.

Дзмітрый Рабаў адзначыў, што да 20 снежня тэмпература паветра ў Беларусі будзе вышэйшай за норму, а потым, на калядныя святы, крыху пахаладае. Аднак, да Новага года тэмпература зноў пачне павышацца. Згодна з доўгатэрміновым прагнозам айчынных спецыялістаў, тэмпература паветра ўначы на Новы год чакаецца прыкладна ў дыяпазоне 1-6 марозу, а ўдзень будзе каля нуля. У гэтыя суткі месцамі па краіне прагназуюцца невялікія ападкі ў выглядзе снегу і мокрага снегу.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Сацыяльны клопат

# ДЗЯРЖАВА КАМПЕНСУЕ

## ІНВАЛІДАМ, ЯКІЯ САМАСТОЙНА НАБЫВАЮЦЬ СРОДКІ РЭАБІЛІТАЦЫІ, БУДУЦЬ ВЯРТАЦЬ ГРОШЫ

**Адпаведны праект пастановы падрыхтаваны і цяпер узгадняецца. Мяркуецца, што дакумент пачне дзейнічаць у наступным годзе. Згодна з ім, інвалідам будуць кампенсаваць з бюджэту суму, выдаткаваную імі на сродкі рэабілітацыі. Гэта тысяцца дыктафонаў, плэераў, тэлефонаў са спецыяльнымі праграмамі, прыстасаванняў для апранання, захопу прадметаў, супрацьпролежневых падушак і матрацаў і іншых неабходных рэчаў. Таксама прадугледжваецца пашырыць Дзяржаўны рэестр тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі, якія выдаюцца інвалідам бясплатна ці на льготных умовах. У гэты пералік уключаць яшчэ 11 пазіцый.**

Сёння ў краіне налічваецца 545,5 тысячы інвалідаў (амаль шэсць працэнтаў ад усяго насельніцтва). Забеспячэнне сродкамі рэабілітацыі — толькі адна з ільгот, што дзейнічаюць для гэтай катэгорыі. Напрыклад, каб дапамагчы людзям з асаблівасцямі ўладкавацца на працу, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ўстанаўліваюць броню. Сёлета для інвалідаў забраніравалі больш за дзве тысячы месцаў. За дзесяць месяцаў бягучага года на гэтыя вакансіі ўладкаваліся 544 чалавекі. Яшчэ васямнаццаці выдалі субсідыі на адкрыццё сваёй справы. З пачатку года заключаны дагаворы з пяццю наймальнікамі аб кампенсацыі і фінансаванні выдаткаў на стварэнне 26 месцаў для інвалідаў. На гэтыя сродкі з Фонду сацабароны насельніцтва пайшло 8 мільярдаў рублёў. Інваліды I і II групы маюць права на скарочаны працоўны тыдзень (не больш за 35 гадзін). Пры гэтым наймальнік абавязаны налічваць ім заработную плату ў поўным памеры.

— Бацькі, якія выхоўваюць дзіця-інваліда, атрымліваюць павялічаныя выплаты, — адзначае намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Аляксандр РУМАК. — Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да трох гадоў (сёння яна раўняецца 3,1 мільёна) складае 45 працэнтаў ад сярэднямесячнага заробку па рэспубліцы за квартал. Гэта на дзесяць працэнтаў больш за выплаты на першае дзіця, і на пяць — за дапамогу на другога і наступных.

Ільготы для інвалідаў прадугледжвае і сістэма адукацыі. Маладыя людзі з асаблівасцямі могуць разлічваць на сацыяльную стыпендыю, вучыцца ў групах з меншай напаўняльнасцю. Праўда, колькасць студэнтаў ВНУ з інваліднасцю застаецца невялікай. Па словах начальніка аддзела спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Антаніны ЗМУШКО, цяпер ва ўніверсітэтах вучыцца каля 1,2 тысячы такой моладзі. Найбольш студэнтаў з асаблівасцямі займаецца ў Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце (216 чалавек).

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## СТРУКТУРА ПРЫЧЫН ІНВАЛІДНАСЦІ ДАРОСЛАГА НАСЕЛЬНІЦТВА

ў 2014 годзе (звесткі прадастаўлены Белстатам)

■ Пераадоленне

# Я САМ ТАКІ,

## або Дзякуй траўме за атрыманую мудрасць

**Мець статус інваліда — нагода хутчэй для смутку, чым для гонару. Гэтыя людзі жывуць побач з намі, але мы імкнёмся іх не заўважаць. Яны жывуць у асаблівым свеце, пра існаванне якога часам не здагадваюцца нават блізкія...**

Яны могуць быць неверагодна таленавітымі і душэўна багатымі людзьмі, але грамадства зацята імкнецца адрынуць тых, хто не ўпісваецца ў «пракрустаў ложак» усеагульнай падобнасці.

Мне 66 гадоў, я стаў інвалідам першай групы пажыццёва пасля таго, як няўдала нырнуў і атрымаў цяжкую траўму пазваночніка. Я паспрабую асэнсаваць паняцце «інваліднасць», па-свойму «ўзважыць» гэта лёсавызначальнае слова ў дачыненні да сябе.

Інваліднасць — гэта, хутчэй за ўсё, лёс. Яна для мяне стала выпрабаваннем, навучыла памяркоўнасці, а яшчэ — думаць і прымаць свет такім, які ён ёсць. Дзякаваць Богу за кожную пражытую хвіліну ў гэтым свеце. Інваліднасць — гэта магчымасць пераасэнсаваць і змяніць да лепшага сваё жыццё. Даказаць, што я не горшы за іншых, а ў нечым нават пераўзыходжу паўнавартасных людзей па мэтанакіраванасці, сіле волі, духу, талентам, дадзеным ад Бога. Калі б я быў здаровым чалавекам, наўрад ці хапіла б мне часу (менавіта часу) падумаць над тым, хто я і навошта нарадзіўся на гэты свет. Мітусня і бытавыя клопаты не дазваляюць гэтага зрабіць. А пасля атрымання траўмы пазваночніка з'явіўся час падумаць і зразумець, што сапраўды важна ў гэтым жыцці.

Інваліднасць — гэта барацьба. Але пасля доўгай барацьбы прыходзіць пакора. Не, я не склаў рукі. Зразумеў: хопіць жыць з думкай, што калі-небудзь вярнуся да мінулага. Хоць адна з галоўных праблем, з якой сутыкаецца чалавек, атрымаўшы цяжкую траўму, — шкадаванне аб страчаным. Гэтыя думкі трэба адкінуць імгненна. Трэба займацца сабой і паралельна прыстасоўвацца, браць ад жыцця максімум і ўсімі сіламі імкнуцца быць карысным іншым людзям.

Інваліднасць — не толькі дадатковая нагрузка, але і стымул да творчасці. Калі б не яна, я не займаўся б тым, чым займаюся цяпер: жывапісам (больш 800 прац), напісаннем нарысаў і аповесцяў, удзелам у краязнаўчых віктарынах і конкурсах, у тым ліку у літаратурных конкурсах (намінацыя «Проза»). Як вынік — мноства дыпломаў і грамат. Супрацоўнічаю з раённай, абласнымі і рэспубліканскімі газетамі. У 2010 годзе выйшла мая кніга «Споведзь чалавека ў інваліднай калясцы». Дзякуй траўме за жыццёвую мудрасць! Дзякуй за тое, што дапамагла рэалізаваць сябе на асабліва складаных адрэзках лёсу. Маёй траўме 35 гадоў, і вельмі цяжка сказаць, кім бы я гэты час мог быць, калі б не інваліднасць. Можа, спіўся б на будоўлях і адышоў у іншы свет, як здарылася са шматлікімі маімі знаёмымі, з якімі працаваў раней?

Каб спраўляцца з бар'ерамі, трэба паставіць перад сабой пэўную мэту і ўпэўнена да яе імкнуцца. Галоўны бар'ер — гэта наш страх і наша лянота. Як змагацца? Рабіць тое, чаго баішся, і кожны дзень, кожную гадзіну, кожную хвіліну пераадольваць сваю ляноту. Гэта аснова поспеху. Я ведаю. Сам такі.

Слова «інвалід» не лічу абразлівым. Хоць трэба глядзець, у якім кантэксце яно гаворыцца. Я ж аддаю перавагу выразу «чалавек з інваліднасцю», таму што галоўнае — гэта чалавек, а з чым ён, з інваліднасцю ці з роварам, гэта ўжо другаснае. У некаторых краінах інваліды — гэта «людзі з павышанымі запатрабаваннямі», у нас — гэта «людзі з абмежаванымі магчымасцямі». Адчуйце розніцу.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дарэчы, мною напісана матэрыялаў не на адну кнігу, іх героі — інваліды. Калі ж перафразіраваць словы К. Сіманава, дык бяда ў тым, што гэтыя рукапісы — усяго толькі рукапісы, якім, па-мойму, варта стаць кнігамі. Пакуль гэта мая блакітная мара, якую, можа, хтосьці пачуе, і яна ажыццявіцца.

Божа, пазбаў нашы душы ад інваліднасці!

**Валерый ВАСІЛЕЎСКІ**

■ Без абмежаванняў

# АДНА «БАЗАВАЯ» — І ТЫ РАМЕСНІК

## Пасільная праца напаўняе жыццё сэнсам

**Я калекцыяную кававыя кубачкі**
**і адусюль, дзе бываю,**
**стараюся прывезці хаця б адзін.**
**Самы кранальны экспанат у маёй калекцыі — кубачак са сподкам,**
**вылеплены і распісаны ўручную,**
**трохі крываваты, з далікатнымі акварэльнымі кветкамі.**
**Ён вылучаецца нейкай цёплай,**
**безабароннай прыгажосцю.**
**Я купіла яго ў сувенірнай краме старога Таліна. Адразу ж, як убачыла на паліцы, не змагла адвесці вачэй...**
**Аказалася, гэты кубачак зроблены чалавекам з інваліднасцю,**
**а сувенірная крамка была сацыяльнай.**

Цяпер такія сацыяльныя крамы, дзе можна купіць вырабы людзей з абмежаванымі магчымасцямі, з'явіліся і ў Беларусі, напрыклад у Баранавічах. Але давайце па парадку...

Раней пры тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва меліся толькі сацыяльна-рэабілітацыйныя майстэрні для людзей з інваліднасцю. Выключна працоўных майстэрняў не было.

У чым розніца паміж сацыяльна-рэабілітацыйнымі і працоўнымі майстэрнямі? Першыя, па словах спецыялістаў, ставяць сваёй мэтай аднаўленне і развіццё парушаных функцый у людзей з інваліднасцю, фарміраванне кампенсаторных навыкаў па самаабслугоўванні, вядзенні хатняй гаспадаркі, навучанне элементарным працоўным аперацыям. Людзі ў такіх майстэрнях лепяць, вырабляюць сувенірную прадукцыю, але не прадаюць яе.

У працоўных майстэрнях людзі з інваліднасцю працуюць па тэрміновым працоўным дагаворы і ў адпаведнасці з рэкамендацыямі МРЭК. І за сваю працу атрымліваюць заработную плату, да таго ж ім ідзе працоўны стаж.

— Давайце будзем шчырымі: людзі з абмежаванымі магчымасцямі, якія маюць псіхафізічныя асаблівасці, сёння неканкурэнтаздольныя на рынку працы, — кажа **дырэктар ТЦСАН Баранавічаў Алена ГЕРМАН.** — Яны па стане здароўя не здольны на роўных канкураваць са здаровымі людзьмі. Як правіла, такія з дзяцінства атрымліваюць пенсію па інваліднасці. Памер яе без працоўнага стажу невысокі... Калі ж чалавек з абмежаванымі магчымасцямі зможа афіцыйна папрацаваць хоць бы некалькі гадоў, то яго пенсія павялічыцца і будзе ісці ўжо як рабочая.

У майстэрнях дзённага аддзялення ТЦСАН Баранавічаў адаптацыя інвалідаў да працоўнай дзейнасці ажыццяўляецца з 2008 года. Гэтая праца фінансуецца са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. У 2008 годзе пачала сваю працу майстэрня па вырабе простай друкаванай прадукцыі, у якой маладыя людзі асвоілі працэс вырабу брашур, часопісаў, запісных кніг, паштовак ручной працы. Для майстэрні былі набыты камп'ютар, капіравальны апарат, каляровы лазерны прынтар і інш. У 2010-м была створана майстэрня, дзе маладыя інваліды асвоілі працу са льном і льновалакном і навучыліся вырабляць сувеніры і пано. У 2012-м адкрылася майстэрня па вырабе папяровых пакетаў для падарункаў і канвертаў. Прадукцыя бязвыплатна перадаецца ў бюджэтныя арганізацыі.

Дарэчы, маладыя інваліды, якія працуюць у адной з такіх майстэрняў, атрымліваюць заработную плату. Яна складае 2 180 126 рублёў у месяц. Пасля заканчэння работ па адаптацыі да працоўнай дзейнасці ім пераразлічваюць пенсію па інваліднасці на працоўную.

Вось ужо другі год пры дзённым аддзяленні ТЦСАН працуюць дзве рамесніцкія майстэрні. Іх наведваюць 16 чалавек.

— Мы прапанавалі маладым людзям стаць рамеснікамі, — кажа Алена Герман. — Бо тыя навыкі, якім мы іх навучылі ў працоўных сацыяльна-рэабілітацыйных майстэрнях, падпадаюць пад рамесніцкую дзейнасць. Нашы падапечныя паспяхова прайшлі адаптацыю да працоўнай дзейнасці і зараз могуць самастойна працягваць працаваць па засвоенай прафесіі. Зарэгістравацца рамеснікам проста: дастаткова заплаціць адну базавую велічыню ў год — і ты можаш працаваць. Так у людзей з інваліднасцю з'яўляецца магчымасць рэалізоўваць сваю прадукцыю — на кірмашах і ў рамках дабрачынных акцый у школах горада... Мы імкнёмся аказваць ім у гэтым садзейнічанне. І ў нас гэта атрымліваецца. А ўжо як яны самі рады!

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

3 СНЕЖНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 24 (15783)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Уладзімір ПУГАЧ:

# «Я МОЦНА ЗАХАПІЎСЯ ЭКСПЕРЫМЕНТАМІ...»

## Гурт «J:Морс» можна назваць «доўгажыхаром» на нашай сцэне

**Калектыў запісвае альбомы, здымае кліпы, збірае аншлагі на канцэртах. Узнікае заканамернае пытанне: на чым трымаецца такі поспех? Адказ, магчыма, хаваецца ў тым, што адзін з яго стваральнікаў Уладзімір Пугач — рамантык па жыцці, які любіць свабоду і заўсёды шчыры ў сваёй творчасці. А ў пачатку лістапада ўбачыў свет новы альбом гурта — «Паветра»... Мы сустрэліся з Уладзімірам і пацікавіліся не толькі новым вынікам працы...**

**— Што адметнага адбылося ў вас асабіста і ў гурце за апошняе пяцігоддзе?**

— У 2010 годзе выйшаў альбом «Электрычнасць», потым мы зрабілі гастрольны тур па гарадах Беларусі, у пачатку і па завяршэнні якога сабралі Палац спорту. А потым я адчуў нейкую разгубленасць, бо не разумеў дакладна, куды рухацца далей. У 2011-2012 гадах мы аб'явілі, што прыпыняем студыйную працу, бо выступаем з канцэртамі, і так працягвалася да канца 2013 года. Многія ўспрынялі тыя нашы дзеянні як распад гурта. Сам заняўся сольным праектам пад назвай «Нафта». Праўда, тая праца не даведзена да канца, бо і я, і тыя музыканты, з якім мы рабілі матэрыял, занятыя пакуль што ў іншых праектах. Спадзяюся, з'явіцца час і распачатае мы давядзём да канца. І толькі калі я зразумеў, што ў мяне назапасіўся патэнцыял, каб рухацца з «J:Морс» далей — гэта быў сігнал нашай гатоўнасці запісваць новы альбом.

**— Склад групы неаднаразова змяняўся. На ваш погляд, такія перамены былі заўсёды карыснымі для калектыву?**

— Кожны раз такі крок мы рабілі з мэтай змяніць нешта да лепшага. Безумоўна, момант сыходу некага з «J:Морс» заўсёды непрыемны. Перш за ўсё, таму што даводзіцца вялікі пласт працы перарабляць, калі ўводзіш новага чалавека ў калектыў.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Фота Андрэя КРАЎЧАНКІ.

Насуперак абставінам

# ДЗЯЎЧЫНА З БАЙЦОЎСКІМ ХАРАКТАРАМ

**Амалія Азацян, лейтэнант унутранай службы МНС, лічыць: чым больш трэба зрабіць, тым больш паспееш. Дзяўчына падарожнічае, любіць фатаграфаваць і чытаць, здымае невялікія фільмы, займаецца спортам, вывучае англійскую мову.**
**Яна і міністру пісьмо напіша,**
**калі ад гэтага залежыць,**
**ці збудзецца яе мара, і зробіць немагчымае магчымым... Галоўнае — мець неверагоднае жаданне і настойлівасць.**

Напэўна, усмешка ніколі не сыходзіць з яе твару!

«Прафесар» — такая мянушка прыклеілася да Амаліі ў пачатковых класах з-за дрэннага зроку. Звычайныя акуляры насіць яна не хацела: аправа пастаянна нагадвала дзяўчынцы, што яна глядзіць на свет праз шкло, ды і рэчы бачыліся зусім іншымі... А вось у круглых, «бабуліных», — усё як на далоні! Ды і мянушка дзяўчынцы падабалася. Тым больш калі глядзела па тэлевізары гульню «Што? Дзе? Калі?» і ўсур'ёз задумалася: а ці не стаць знатаком? Пазней хацела стаць урачом, будаўніком, кухарам...

Спачатку Амалія вучылася ў Гудагайскай сярэдняй школе, а ў пятым класе перайшла ў Астравецкую гімназію №1. Здаецца, тады і вырашыла, што ваенная спецыяльнасць — яе мара. А паглядзеўшы расійскі серыял «Кадэцтва», адразу ж пачала высвятляць, ці ёсць у Беларусі суворaўскае вучылішча. Вядома — ёсць! Але Амалію чакала расчараванне — вучыцца там могуць толькі хлопчыкі...

— У школе я займалася і ў тэатральным, і ў валанцёрскім, і ў спартыўным гуртку, — дзеліцца Амалія. — Праўда, з апошнім былі праблемы: урачы заўсёды прызначалі мяне ў спецыяльную групу для заняткаў фізічнай культурай. І ніхто нават нічога не хацеў слухаць пра тое, што калі-небудзь я надзену вайсковую форму... Пасля 9 класа паступіла ў Гродзенскі ліцэй пры ўніверсітэце імя Янкі Купалы на фізіка-матэматычны профіль у... кадэцкі клас.

Тут амаль збыліся мары пра ваенную кар'еру — дзяўчына хадзіла страявым крокам, страляла з вінтоўкі, нават з гранатамёта.

— Тады я дакладна і вырашыла — буду вайскоўцам. Пачала рыхтавацца, праглядала прахадныя балы на ваенныя спецыяльнасці — трэба было набраць іх не менш за 300. Разумела, што трэба шмат часу сядзець над кніжкамі, дадаткова займацца, каб атрымаць такі вынік. У ліцэі, вядома, весела, але рыхтавацца трэба было ўсё ж такі ў выкладчыкаў па матэматыцы і фізіцы, з якімі я займалася ў гімназіі, — успамінае дзяўчына. — Пакінуць кадэцкі клас, развітацца з формай, трэніроўкамі па каратэ было нялёгка. Але я ведала, што так трэба, каб аднойчы зноў апрануць форму, але ўжо афіцэрскую. І ў адзінаццаты клас вярнулася ў гімназію.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

Свой выбар

# ПЕРШЫ РАЗ, ПЕРШЫ КЛАС,

## або З пачынам, маладыя педагогі!

**Гэты верасень запомніцца як асаблівы і першакласнікам, і маладым спецыялістам, якія толькі распачалі настаўніцкую дзейнасць. Мы знайшлі сёлетніх выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і папрасілі іх расказаць пра свае першыя тыдні працы ў школе.**

### Вясковая душа

Выпускніца гістарычнага факультэта Валянціна Шэшка паступала ў БДПУ з мэтавым накіраваннем і загадзя ведала, што пасля выпуску яе размяркуюць у Старадарожскі раён.

— За чатыры гады навучання ў сталіцы я дакладна зразумела: вялікі горад не для мяне. Я «вясковая душа». Таму ніякіх шкадаванняў ад таго, што еду сюды, не было, — расказвае дзяўчына. — Іншы момант, што ў Крываносах раней я ніколі не была. Перажывала з-за таго, як прымуць у калектыве. У выніку сустрэлі мяне цёпла, усе радаваліся, што да іх прыйшла такая маладая супрацоўніца. Увогуле, моладзі ў нас працуе мала: я, псіхолаг і бібліятэкар — астатнім за 35 гадоў.

Валянціна выкладае гісторыю ў 8—11 класах. Па словах суразмоўцы, агульную мову з падлеткамі яна знайшла хутка, а невялікая розніца ва ўзросце толькі паспрыяла гэтаму. Маладая настаўніца часта выкарыстоўвае мультымедыйны матэрыял на занятках: гэта і дзецям падабаецца, і ёй працу спрашчае.

— Вольны час па магчымасці праводжу з мужам, мы пабраліся шлюбам на пачатку верасня, але з-за працы пакуль жывём асобна, — прызнаецца Валянціна. — Увечары я звычайна сяджу за камп'ютарам. Бывае, лаўлю сябе на думцы, што не хапае шуму, толькі не гарадскога, а дзіцячага.

Пакуль настаўніцу ўсё задавальняе. Тут ёй нават часовае бясплатнае жыллё прадаставілі — цэлы прыватны дом, які знаходзіцца ў пяці хвілінах хады ад школы.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

«Інфармацыя на ўроку павінна быць візуальнай», — лічыць Генадзь Гапановіч.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
3 12 2015 г.

Мазгавы штурм

# Экзамен для «фабрыкі думкі»

## Каля 50 маладых аналітыкаў сабрала пятая, заключная, рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Парадак-2015»



**Усе яны з'яўляюцца ўдзельнікамі нацыянальнай праграмы па пошуку, адборы і навучанні маладых аналітыкаў для органаў дзяржаўнага кіравання «Разумныя сеткі». Сярод патрабаванняў да ахвотнікаў далучыцца да праекта былі наяўнасць аналітычных здольнасцяў, шырокі палітычны кругагляд і імкненне ствараць аналітычны прадукт для практычнага выкарыстання ў рабоце органаў дзяржаўнага кіравання.**

— Тры гады таму, калі праект толькі распачынаўся, мы знаходзіліся зусім у іншых і геапалітычных, і эканамічных умовах. Але за апошні час свет моцна змяніўся, мы становімся сведкамі драматычных падзей, якія тым ці іншым чынам закранаюць і нашу краіну, — падзяліўся сваёй думкай **дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Аляксей ДЗЕРБІН**. — Палітычная сітуацыя ўскладняецца і становіцца ўсё менш прагназаванай. У такіх умовах ролю аналітыкаў, здольных пралічыць розныя варыянты развіцця падзей, цяжка пераацаніць. Праект «Разумныя сеткі» стаў добрым прыкладам таго, як можа быць выстраена праца з маладымі інтэлектуаламі, як ствараюцца і могуць функцыяваць вертыкальныя каналы сувязі, свайго роду «сацыяльныя ліфты» для маладых людзей.

Сёння пад эгідай праекта «Разумныя сеткі» створана маладзёжная «фабрыка думкі», якая аб'ядноўвае ўжо больш як 180 маладых аналітыкаў ва ўзросце да 35 гадоў з усёй Беларусі... Слоган праекта — «Пра палітыку не для кухні і не для форуму».

Сам «Парадак-2015» уяўляе сабой цыкл з пяці навукова-практычных канферэнцый, якія праходзілі на базе БДУ і МДЛУ ў 2013-2015 гадах. Для маладых людзей важна, што іх прапановы не пыляцца на паліцах, што яны могуць прыйсці са сваім пунктам погляду, са сваёй ідэяй у гэты праект і быць пачутымі на самым высокім узроўні. Што яны могуць весці прамы дыялог з міністрамі, з іншымі работнікамі дзяржаўных структур, прыводзіць свае аргументы і дыскутаваць. Вось і на завяршальную сустрэчу з маладымі аналітыкамі прыйшлі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

**Член пастаяннай парламенцкай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Дзмітрый ШАЎЦОЎ** паабяцаў, што парламент акажа падтрымку ў рэалізацыі найлепшых ідэй праекта «Разумныя сеткі».

— Безумоўна, тыя праекты, якія насамрэч акажуцца вельмі значнымі і карыснымі, знойдуць свой працяг, — падкрэсліў парламентарый. І дадаў, што сярод прапанаваных ёсць вельмі цікавыя ідэі: па некаторых з іх хочацца з аўтарам тут жа падыскутаваць...

**На думку члена Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах, кандыдата эканамічных навук Валерыя БАРАДЗЕНІ**, менавіта маладыя людзі з'яўляюцца «галоўным рухавіком» у любым грамадстве, таму «маладзёжную карту» ўсе спрабуюць разыграць:

— Я, напрыклад, не разумею, чаму ў нас выкладчык павінен прымушаць студэнтаў вучыцца, хоць ва ўсім свеце ўсё адбываецца наадварот: студэнты прымушаюць выкладчыка аддаць ім усё, што ён ведае і ўмее, і нават больш. У эканамічным універсітэце даўно ўсе зразумелі, што перш чым ісці да выкладчыка на экзамен ці залік, трэба як мінімум пачытаць падручнік. Платныя пераздачы экзаменаў у БДЭУ ўвялі ўжо даўно.

Аналагічнае пытанне прагучала і з залы ад маладых аналітыкаў: **чаму выкладчыкі павінны пераўтварацца ў нянек для студэнтаў?** Бо гэта разбэшчвае і маладых людзей, якіх пасля заканчэння вучобы ў ВНУ яшчэ два гады даводзіцца прывучаць сістэмна працаваць... Выдзяленне сродкаў на фінансаванне ВНУ ў залежнасці ад колькасці студэнтаў фактычна робіць выкладчыкаў заложнікамі сітуацыі: у адлічэнні нават слабых студэнтаў ніхто не зацікаўлены...

Пацікавіліся маладыя аналітыкі і думкай Валерыя Барадзені наконт зніжэння прадпрымальніцкай актыўнасці з боку маладых людзей.

— Ва ўмовах эканамічнага крызісу гэта натуральна. Але я згодны, што моладзь павінна праяўляць больш прадпрымальніцкай ініцыятывы. Трэба генерыраваць ідэі, ствараць бізнес, не баяцца прагарэць, трэба шукаць крыніцы фінансавання, — падкрэсліў ён. — Дзяржава чакае ад маладых людзей новых прапаноў і новых інавацыйных прадуктаў. Свежы, крэатыўны погляд часам бывае вельмі карысны.

Не сакрэт, што дзяржаўныя органы разглядаюць удзельнікаў праекта «Разумныя сеткі» як інтэлектуальны кадравы рэзерв і запрашаюць на работу найбольш актыўных. Аналітыкі праекта ўжо працуюць у Інфармацыйна-аналітычным цэнтры, у міністэрствах эканомікі і адукацыі.

Спецыяльна для ўдзельнікаў «Разумных сетак» у верасні 2014 года у Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі адкрылася магістратура па спецыяльнасці «Палітычны аналіз і палітычныя тэхналогіі ў медыясферы». Зараз

**Дзяржаўныя органы разглядаюць удзельнікаў праекта «Разумныя сеткі» як інтэлектуальны кадравы рэзерв і запрашаюць на работу найбольш актыўных. Аналітыкі праекта ўжо працуюць у Інфармацыйна-аналітычным цэнтры, у міністэрствах эканомікі і адукацыі.**

у ёй навучаюцца 14 аналітыкаў праекта.

На пятай заключнай канферэнцыі маладыя аналітыкі абмяркоўвалі меры дзяржаўнай падтрымкі грамадскіх ініцыятыў у сферы распаўсюджвання навуковых ведаў і папулярызацыі навуковай дзейнасці, праблемы арганізацыі службы «Адно акно» і праект «Інфарматызацыя і аналіз у рабоце са зваротамі грамадзян», канцэпцыю «Маладзежныя лідары 2.0» па падрыхтоўцы новага пакалення не толькі маладзёжных лідараў, але і, магчыма, будучых лідараў краіны, стварэнне асацыяцыі нафтахімічнай прамысловасці, маладзёжны праект «Беларусь вачамі беларусаў або Belarus BY» і іншыя.

**Павел ЛАРЫЁНАЎ, студэнт V курса Міжнароднага дзяржаўнага экалагічнага інстытута БДУ:**

— Я і мой суаўтар, студэнт-пяцікурснік БНТУ Юрый Старавойтаў, прапануем увесці курс даўрачэбнай медыцынскай дапамогі ва ўсіх ВНУ. Сам я вучуся на спецыяльнасці «медыка-біялагічная справа», але нават у нас такіх ведаў студэнтам не даюць. Часткова «азам» першай дапамогі дзяўчат навучаюць у школе ў рамках медыцынскай падрыхтоўкі. Часткова даюць адпаведныя веды ў аўташколах, але там пераважна разглядаюцца сітуацыі, звязаныя з дарожна-транспартнымі здарэннямі. А ці многія ведаюць, напрыклад, алгарытм дзеянняў пры ўкусе змяі? Ці вось яшчэ адна сітуацыя: маленькае дзіця праглынула хімічна агрэсіўнае рэчыва (а такіх вакол нас цяпер шмат)...

Мы з сябрам правялі анкетаванне, каб даведацца сапраўдны ўзровень ведаў па аказані першай дапамогі сярод студэнтаў нашага інстытута і на гістарычным факультэце БДУ. Дык вось, толькі 17 працэнтаў апытаных паведамілі, што ў большасці выпадкаў яны змогуць аказаць першую дапамогу. Прапаноўвалі розныя сітуацыі: паражэнне электрычным токам, укусы жывёлін і насякомых, раптоўныя роды, вострыя атручэнні і гэтак далей... Калі ў грамадскім месцы чалавеку становіцца дрэнна, мала хто падыходзіць, каб яму дапамагчы. Мяркую, што гэта адбываецца не таму, што ўсе вакол абыякавыя, а таму, што большасць з нас не ўпэўнены, што зможам зрабіць усё правільна. Вось чаму мы прапануем інтэграваць усе веды ў адзіны вучэбны курс па аказанні першай медыцынскай дапамогі. Магчыма, менавіта яны і будуць самымі карыснымі і запатрабаванымі.

Студэнт года

# «КАРАЛІ НАЧНОЙ ВЕРОНЫ»... АДПАЧЫВАЮЦЬ!

## У тройцы найлепшых — адны дзяўчаты

**У Мінску вызначыліся пераможцы гарадскога этапу рэспубліканскага конкурсу «Студэнт года — 2015». За пуцёўку ў рэспубліканскі фінал змагаліся 13 студэнтаў самых буйных сталічных універсітэтаў (шасцёра юнакоў і сем дзяўчат), якія перамаглі на аналагічных спаборніцтвах у сваіх ВНУ.**

Да пачатку конкурсу ў фае Камандна-інжынернага інстытута МНС разгарнуліся некалькі інтэрактыўных пляцовак. На пляцоўцы «#Я выбіраю Мінск_БРСМ» «выросла» маладая яблынька — сімвал Года моладзі, а дзяўчаты-валанцёры з хэштэгам, прысвечаным Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ, прапаноўвалі ўсім ахвотным зрабіць памятнае фота на фоне цудоўнага дрэва. Зрабіць сэлфі ці групавы фотаздымак можна было таксама на пляцоўцы «Тэатр пачынаецца з вешалкі» — тут гасцей сустракалі дамы ў сярэдзявечных строях і мужчыны ў фраках. На пляцоўцы меўся тэатральны рэквізіт — касцюмы і маскі, якія можна было прымераць на сябе падчас фатаграфавання. Побач размясцілася майстэрня «МіМ БДУ», дзе з дапамогай мастакоў-аквагрымёраў можна было ў лічаныя хвіліны займець цікавы фейс-арт. А па дарозе ў глядацкую залу гасцей чакала фотасушка, на якой госці маглі бліжэй пазнаёміцца з канкурсантамі.

Мінскі адборачны тур уключаў пяць конкурсаў. Яшчэ да пачатку спаборнітцваў журы выставіла ацэнкі па трох «завочных» конкурсах. Ацэньваліся «Партфоліа ўдзельніка» (матэрыялы пра дасягненні канкурсантаў у вучобе, творчасці, навуцы, спорце і грамадскай дзейнасці), аўтарскі відэаролік «Я — студэнт» і «Праект у Год моладзі» (прэзентацыя маладзёжнага праекта, рэалізаванага канкурсантам у бягучым годзе).

Пачатак вочным спаборніцтвам паклаў нумар «Каралі начной Вероны» ў выкананні... курсантаў Акадэміі МУС. Пад гэтую вядомую кампазіцыю ўдзельнікі выйшлі на сцэну ў касцюмах тэатральных і кінагерояў. Далей у конкурсе «Прэзентацы-Я» кожны з удзельнікаў расказваў пра сябе, сваю прафесію і ўніверсітэт. А ў творчай эстафеце «Маладая Беларусь» канкурсанты дэманстравалі індывідуальныя таленты — пелі, танцавалі, чыталі вершы, паказвалі гумарыстычныя сцэнкі, адным словам, спрабавалі здзівіць і прыцягнуць увагу членаў журы. Атрымалася гэта ў траіх: рашэннем журы у рэспубліканскі фінал выйшлі Вольга СЯЧКО (Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт), Аляксандра МУРЗОЎСКАЯ (БНТУ) і Марына ВІШНЕЎСКАЯ (Камандна-інжынерны інстытут МНС).

А ў інтэрнэт-конкурсе «Студэнт года online», які праходзіў у супольцы «Мінск—БРСМ» у сацыяльнай сетцы «УКантакце» перамагла Аляксандра Мурзоўская, якая набрала 1228 галасоў інтэрнэт-карыстальнікаў.

Ведай нашых!

# ПАРАЗВАЖАЎ ПРА ФЕЕРБАХА

**Адзінаццацікласнік Ліцэя БДУ Павел Бялькевіч удастоены дыплома Міжнароднага Балтыйскага конкурсу эсэ па філасофіі для школьнікаў — 2015 (Baltic Sea Philosophy Essay Event — 2015). Гэтую ўзнагароду ён заваяваў за сваё філасофскае эсэ «Адзінаццаты тэзіс Карла Маркса пра Феербаха».**

Свае работы юныя філосафы прадставілі ў рэжыме анлайн. Эсэ даслалі 160 навучэнцаў з 13 краін: Беларусі, Даніі, Эстоніі, Фінляндыі, Грэцыі, Венгрыі, Індыі, Ізраіля, Мексікі, Нарвегіі, Польшчы, Сербіі і Паўднёвай Карэі. Трактаты былі выкананы старшакласнікамі на англійскай мове. Тэмы вызначалі самі арганізатары.

Работы ацэньвала міжнароднае журы. Пры гэтым браліся пад увагу разуменне заяўленай філасофскай праблемы, пераканаўчасць прыведзеных аргументаў, паслядоўнасць і лагічнасць выкладання сваёй пазіцыі і арыгінальнасць эсэ.

Міжнародны Балтыйскі конкурс эсэ па філасофіі для школьнікаў ініцыяваны Фінскай і Нарвежскай асацыяцыямі філасофскіх таварыстваў пры падтрымцы ЮНЕСКА. Па традыцыі ён прымеркаваны да Сусветнага дня філасофіі.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

*Крок да прафесіі*

# КВЭСТ ДЛЯ БУДУЧЫХ «АЙЦІШНІКАЎ»

**Дзень БДУІР прайшоў у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня».**

— Зараз на змене знаходзяцца школьнікі з 7-га па 11-ты клас, якія праявілі сябе ў тэхнічнай творчасці. Яны могуць стаць нашымі патэнцыяльнымі абітурыентамі, таму стаяла задача як мага больш цікава і захапляльна расказаць пра наш універсітэт, каб дзецям захацелася ў нас вучыцца, — расказала **кіраўнік прэс-службы ўніверсітэта Ала БАЯРКА.** — Такім чынам быў дадзены старт прыёмнай кампаніі 2016 года...

Насычаную праграму дня склалі майстар-класы, выставы, гульні і конкурсы. Выхаванцы «Зубраняці» збіралі кубік Рубіка, гулялі ў «Што? Дзе? Калі?» і «Мелатрэк», а таксама праслухалі лекцыю пра нанаматэрыялы і нанатэхналогіі. Маладзёжнае ТБ БДУІР арганізавала для падлеткаў фотазону і конкурс сэлфі, а рэдакцыя ўніверсітэцкай газеты «Імпульс» заахвочвала фірменнымі ручкамі і нататнікамі за хуткаснае складанне «пазлаў» першай паласы.

Вучняў выпускных класаў, у першую чаргу, цікавілі спецыяльнасці, умовы паступлення і навучання. Пра сябе школьнікам расказвалі прадстаўнікі адразу трох факультэтаў: камп'ютарных сістэм і сетак (ФКСІС), камп'ютарнага праектавання (ФКП) і факультэта радыётэхнікі і электронікі (ФРЭ). Таксама адбыліся каля дзесяці майстар-класаў. Асобна варта адзначыць квэст па гісторыі БДУІР, які правялі прадстаўнікі Студэнцкага савета БДУІР — Мікіта Дубко і Ірына Дораш.

Ключавым конкурсам стала напісанне эсэ на тэму «Хачу стаць студэнтам БДУІР». Усе працы былі непасрэдна на месцы праверaны журы, і Дзень БДУІР завяршыўся цырымоніяй узнагароджання пераможцаў конкурсу.

Наступная паездка прадстаўнікоў БДУІР у «Зубраня» адбудзецца ў лютым. Плануецца, што супрацоўніцтва ўніверсітэта з дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтрам будзе пастаўлена на пастаянную аснову.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

*У руху*

# НАШ «ЗЯЛЁНЫ СЛЕД» У ПАРЫЖЫ

**Беларускія школьнікі ў завочнай форме бяруць удзел у кліматычный канферэнцыі ў Парыжы, якая будзе доўжыцца там да 11 снежня.**

Сёлета падлеткі з двух гарадоў — Полацка і Наваполацка — упершыню далучыліся да кампаніі ZOOM «Дзеці ў руху», якая запрашае дзяцей па ўсёй Еўропе здзяйсняць іх паўсядзённыя падарожжы кліматычна дружалюбным спосабам. Збіраючы так званыя «зялёныя сляды», дзеці робяць свой маленькі ўклад у абарону клімату. За паўтара месяца школьнікі сабралі амаль чатыры тысячы такіх «зялёных слядоў» з пажаданнямі да ўдзельнікаў 21-й канферэнцыі бакоў Рамачнай канвенцыі ААН па змяненні клімату, якая праходзіць зараз у французскай сталіцы. «Сляды», зробленыя з каляровай паперы, дзеці атрымлівалі за кожную сваю паездку на грамадскім транспарце, веласіпедзе або прагулку пешшу, за эканомію электраэнергіі і вады.

Усяго 257 падлеткаў з трох школ Полацка і Наваполацка вучыліся больш уважліва ставіцца да экалагічных наступстваў сваіх падарожжаў. Найперш удзельнікі акцыі даведаліся, што выкіды ад аўтамабіляў вельмі шкодныя для іх здароўя, а, значыць, карыстацца асабістым транспартам трэба як мага радзей. Разам з настаўнікамі школьнікі таксама ставілі практычныя доследы, каб зразумець, як дзейнічае парніковы эфект. І як самыя сапраўдныя журналісты бралі інтэрв'ю ў сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, каб прасачыць, як змянялася гарадская мабільнасць цягам некалькіх пакаленняў.

У Парыж «зялёныя сляды» беларускіх школьнікаў адправіліся разам з прадстаўнікамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Самыя цікавыя з іх будуць прадстаўлены на канферэнцыі на беларускім стэндзе. Пажаданні дзяцей — своеасаблівы сігнал удзельнікам мерапрыемства прыкласці максімум намаганняў для абароны клімату.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ДЗЯЎЧЫНА З БАЙЦОЎСКІМ ХАРАКТАРАМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Памятае Амалія, як пайшла зноў на медкамісію, як ёй соты раз сказалі, «з такім зрокам — ніякіх ваенных спецыяльнасцяў».

— Я яшчэ прыйду да вас у форме! — адказала настойлівая дзяўчына.

І прыйшла, калі пасля прысягі ў Гомельскім інжынерным інстытуце Міністэрства па надзвычайных сітуацыях яе адпусцілі дадому.

...Як? Лёс-чараўнік аднойчы ў інтэрнэце завёў Амалію на сайт МНС. І калі яна ўбачыла загаловак «Ліст міністру», то, зразумела, звярнулася да Уладзіміра Аляксандравіча Вашчанкі з просьбай, каб той дазволіў ёй паступаць у ВНУ МНС.

Нарэшце мара Амаліі ажыццявілася: зарадка ў 6 гадзін, ваенная падрыхтоўка, пастаянны кантроль, нарады, 94 чалавекі на курсе, з якіх толькі 8 дзяўчат...

— Самае складанае — доўгі час не бачыць і не чуць родных. Калі ты ведаеш, што цябе чакаюць, любяць — гэта самая лепшая падтрымка ў складаныя хвіліны. Цяжка было растлумачыць маёй малодшай сястрычцы Анхеліцы, чаму «забылася» дарогу дадому, чаму не тэлефаную. Яна з крыўдай казала, што я знайшла сабе новую сям'ю, — узгадвае Амалія. — Сястрычка ў нечым мела рацыю. Я знайшла сям'ю — наш вялікі дружны курс. Памятаю, як мы ездзілі на ўборку бульбы: працавалі з раніцы да вечара, а затым збіраліся ля вогнішча, спявалі песні, гулялі ў «мафію». Памятаю, як дапамагалі адзін аднаму ў вучобе. Як з сяброўкай ледзь не засталіся без водпуску, таму што вырашылі павіншаваць аднакурсніка ноччу з днём нараджэння: з тортам, з 18 шарыкамі заявіліся ў казарму...

Час прайшоў хутка, і на пагонах Амаліі сёлета зазіхацелі доўгачаканыя лейтэнанцкія зорачкі, а ў дыпломе з'явіўся запіс — спецыяльнасць «папярэджанне і ліквідацыя надзвычайных сітуацый». А што далей? Як не дзіўна, Амалія яшчэ на першым курсе вырашыла, што вернецца на Астравеччыну.

— Працую ў раённым аддзеле па надзвычайных сітуацыях. За мной замацаваны аб'екты на будоўлі АЭС, дзе я сачу, каб не было парушэнняў па пажарнай бяспецы. Крыху шкада было адмовіцца на размеркаванні ад месца ў Гомельскім ліцэі МНС, бо мне хацелася працаваць з кадэтамі. Памятаю, як яшчэ на практыцы я «дапякла» ўсіх расповедамі пра міжнародны злёт у Гомелі, куды прыехалі юныя ратавальнікі з 15 краін. Падумалася: чаму б на базе Астравецкай сярэдняй школы не арганізаваць кадэцкі клас? Ідэю падтрымалі: цяпер вучу «маіх» кадэтаў хадзіць страявым крокам, аказваць першую медыцынскую дапамогу. Займаемся і пажарным спортам: вучымся падымацца па пажарных лесках, бегаем пажарную эстафету, пераадольваем стаметровую паласу перашкод. Будзем сур'ёзна рыхтавацца да конкурсаў юных ратавальнікаў, каб займаць толькі прызавыя месцы, — з усмешкай расказвае Амалія.

Нарэшце на пагонах дзяўчыны зазіхацелі лейтэнанцкія зорачкі.

Міністр па надзвычайных сітуацыях Уладзімір Вашчанка дае Амаліі апошнія настаўленні. А яна не забылася падзякаваць за дазвол паступаць у ВНУ МНС.

У дзяўчыны атрымліваецца ўсё, за што б яна ні ўзялася. Сярод шматлікіх захапленняў можна вылучыць два самых-самых — бег і кнігі.

— Бег дапамагае мне зняць стрэс, прывесці думкі ў парадак; падчас прабежкі нараджаюцца новыя ідэі. Раю ўсім! Нават пяць хвілін — лепшае лякарства, — дзеліцца дзяўчына. — А кнігі прыносяць асалоду. Прывучыла сябе чытаць не менш за 50 старонак раніцай альбо вечарам.

**Нарэшце мара Амаліі ажыццявілася: зарадка ў 6 гадзін, ваенная падрыхтоўка, пастаянны кантроль, нарады, 94 чалавекі на курсе, з якіх толькі 8 дзяўчат...**

Дарэчы, нядаўна няўрымслівая дзяўчына ўдзельнічала ў Мінскім Polo-марафоне і прабегла дыстанцыю ў 21 кіламетр за дзве гадзіны дваццаць пяць хвілін. Адразу ж Амалія паставіла новую мэту — адолець поўную дыстанцыю — 42 кіламетры. Упэўнена, у яе і гэта атрымаецца!

**Юлія БУКЕЛЬ, студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

*Захапляльная навука*

# ЦІ ЗАЦВІТУЦЬ НА МАРСЕ ЯБЛЫНІ?

**Фестываль навукі «Карпарацыя ведаў» праходзіць гэтымі днямі ва ўстановах адукацыі сталіцы: на базе Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнай і тэхнічнай творчасці, школ, каледжаў і ВНУ. Мерапрыемства арганізавана пры падтрымцы Міністэрства адукацыі, Дзяржаўнай карпарацыі па атамнай энергіі «Расатам» і Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.**

«Карпарацыя ведаў» — гэта майстар-класы, адкрытыя лекцыі, панэльныя дыскусіі і навуковыя ток-шоу. З папулярнымі лекцыямі па фізіцы, хіміі, крышталяграфіі, біялогіі, эканоміцы, псіхалогіі, геаграфіі, матэматыцы і гісторыі перад школьнікамі і студэнтамі выступяць беларускія і расійскія вучоныя і эксперты. Тэмы — адна цікавейшая за другую: «Калі на Марсе зацвітуць яблыні?», «Выкарыстанне радыенуклідаў у медыцынскай практыцы», «Вялікія псіхалагічныя эксперыменты: штосьці пайшло не так», «Чалавек пераўтвараецца ў кібарга», «Нобелеўская прэмія вакол нас» і многія іншыя.

Мінскі гандлёвы каледж запрашае 3 снежня на кулінарны майстар-клас «Навука. Смачна», на якім гасцям раскажуць пра нацыянальны беларускі прадукт, яго гісторыю, біяхімічныя ўласцівасці і навучаць гатаваць з бульбы смачныя стравы. А 4 снежня ў Рэспубліканскім цэнтры інавацыйнай і тэхнічнай творчасці адбудзецца прагляд эпізодаў фільма «Марсіянін» з наступным абмеркаваннем: наколькі рэальна тое, што паказана ў фільме, якія тэхналогіі ўжо маюцца, а якія — справа недалёкай будучыні.

Усяго падчас правядзення фестывалю запланавана больш за два дзясяткі мерапрыемстваў. Азнаёміцца з падрабязнай праграмай яго правядзення можна на сайце Рэспубліканскага цэнтра інавацыйнага і тэхнічнай творчасці www.rcitt.by. Уваход на ўсе мерапрыемствы свабодны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
3 12 2015 г.

Справы маладых

# НАВУКОВЕЦ З ДУШОЙ РОКЕРА

**З дацэнтам кафедры тэхналогіі шкла і керамікі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Міхаілам ДЗЯДЗЕНКАМ мы сустракаемся ў адной з лабараторый ВНУ. Валаконная оптыка — яго прызванне. Акрамя поспехаў у выкладчыцкай дзейнасці, на рахунку Міхаіла шматлікія навуковыя распрацоўкі ў гэтай сферы. Пры гэтым яму ўсяго толькі 31 — зусім юны ўзрост для навукоўца.**

— Можна сказаць, што ў Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт я трапіў выпадкова, — прызнаецца Міхаіл. — Пасля школы ў Лідзе, якую скончыў з залатым медалём, спрабаваў паступіць у БДУ на спецыяльнасць «матэматычная кібернетыка», але не хапіла аднаго бала. Увечары, разлаваны сам на сябе, вырашыў: проста выпадкова адкрыю зборнік, куды палец трапіць, туды і панясу дакументы. Зборнік адкрыўся на старонцы з інфармацыяй пра БДТУ. З тых часоў я тут: адвучыўся, пасля паступіў у аспірантуру, абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Шкло для атрымання валаконна-аптычных элементаў». Маёй навуковай працай кіруе загадчык кафедры тэхналогіі шкла і керамікі прафесар Іван Адамавіч Лявіцкі, якому я вельмі ўдзячны за дапамогу.

Трэба адзначыць, што даследаванні па гэтай тэме — фактычна першыя ў Беларусі, дагэтуль ніхто ў нас не займаўся іх распрацоўкай. Вынікі можна лічыць унікальнымі для ўсёй постсавецкай прасторы. Нават у суседняй Расіі, дзе пасля распаду СССР захаваўся асобны Дзяржаўны аптычны інстытут, навуковая праца ў гэтым напрамку амаль спынена.

Пры гэтым перспектыўнасць кірунку сумненняў не выклікае: акрамя традыцыйнага ўжывання аптычнага валакна для перадачы даных (у большасці новабудоўляў доступ у інтэрнэт ажыццяўляецца пры дапамозе гэтай тэхналогіі), яго выкарыстоўваюць у абароннай прамысловасці, медыцыне, праваахоўнай дзейнасці, нафтаздабычы і многіх іншых сферах. Скажам, знаёмы многім прыбор эндаскоп, які дазваляе літаральна зазірнуць усярэдзіну чалавечага арганізма, працуе па прынцыпах валаконнай оптыкі. Тое ж самае можна сказаць і пра бараскоп, дзякуючы якому на мытні правяраюць бензабакі машын на наяўнасць кантрабанды, не ўскрываючы кузаў.

— Увогуле, оптавалакно змяняе сусвет, — кажа Міхаіл Дзядзенка. — Напрыклад, перыскопы на падводных лодках можна рабіць менш грувасткімі і крохкімі, калі замест сістэмы люстэркаў выкарыстоўваць светаводы, якія пераносяць святло літаральна ў сабе.

Навуковец дэманструе некаторыя ўзоры оптавалаконных прыбораў, напрыклад, факон. Гэта невялічкі ўсечаны конус, зроблены з аптычнага шкловалакна. Калі на вузейшым яго канцы знаходзіцца нейкая выява, з другога з'яўляецца павялічанае ў некалькі разоў адлюстраванне. Яшчэ адзін прадмет — дэталь ад начнога прыцэла. Пасля апрацоўкі люмінісцэнтным саставам прылада дае дакладнае і чыстае адлюстраванне прадметаў нават ва ўмовах слабога асвятлення.

**Амаль увесь свой вольны час Міхаіл прысвячае дачцэ і жонцы. А яшчэ піша вершы і складае... тэксты песень для аднаго з расійскіх рок-гуртоў.**

— Яшчэ адзін кірунак працы — радыёпразрыстае і радыёахоўнае шкло, — распавядае Міхаіл. — Цяпер такая прадукцыя набывае папулярнасць, але нашай краіне прыходзіцца набываць яе за мяжой, бо вытворчасць у Беларусі пакуль не наладжана. Самы просты прыклад ужывання — мікрахвалёвыя печкі. У большасці з іх унутры ёсць такі своеасаблівы каўпак з керамікі або шклокерамікі, які абараняе выпраменьвальнік ад пырскаў і пашкоджанняў і адначасова не замінае распаўсюджвацца мікрахвалям. Гэта прыклад радыёпразрыстага шкла. Радыёахоўнае, наадварот, выконвае ролю экрана і можа ўжывацца шмат дзе: для шклення ў дзіцячых садках і грамадскіх установах, у якасці радыёабаронных акуляраў і гэтак далей. Бо электрамагнітныя палі, якія нас акружаюць, шкодзяць здароўю: уплываюць на сардэчна-сасудзістую і нервовую сістэмы, і таму людзей трэба абараняць ад іх.

Матэрыяльна-тэхнічная база БДТУ дае даволі вялікія магчымасці. Вынікі і доследныя экземпляры новых саставаў шкла, якія робяць тут, аддаюць на вытворчасць. Гатовыя составы, распрацаваныя ў тым ліку і Міхаілам, звычайна выкарыстоўваюць на заводзе «Оптык» у яго роднай Лідзе.

Не будзем забывацца і на тое, што, акрамя даследаванняў, Міхаіл займаецца выкладаннем ва ўніверсітэце. Параўноўваючы сваё пакаленне студэнтаў з сённяшнім, Міхаіл кажа, што «слабых» цяпер больш. Праблема, на яго думку, заключаецца ў першую чаргу ў адборы абітурыентаў: калі раней самай нізкай адзнакай для паступлення была тагачасная «тройка», то цяпер і тыя, хто здаў тэсціраванне, па ранейшых мерках, фактычна на адзнаку «нездавальняюча», могуць прэтэндаваць на месца ва ўніверсітэце.

— Я думаю, што многія праблемы цяперашняй студэнцкай моладзі пачынаюцца са школы, — распавядае Міхаіл. — Вось яскравы прыклад: ва ўніверсітэце мы займаемся прафарыентацыйнай працай, ездзім па школах і расказваем пра спецыяльнасці, якія можна атрымаць у БДТУ. Аднойчы я зайшоў у клас, а дзеці сядзяць без настаўніка, занятыя сваімі справамі. Гэта была сярэдзіна ўрока, а яны нічога не рабілі па тэме. Цяперашнія студэнты і самі нярэдка прызнаюцца, што ў школах настаўнік фізікі проста даваў ім задачы, а сам сыходзіў. І гэта не адзінкавыя гісторыі, іх шмат. Але пры гэтым моцных студэнтаў таксама нямала. Я сказаў бы, стала значна больш «сярэдніх», з якімі трэба шчыльна працаваць, каб быў плён.

Распавядае Міхаіл і пра свой побыт. Ужо чатыры гады, як ён жанаты. Дагэтуль сям'я Дзядзенкаў жыла ва ўніверсітэцкім інтэрнаце, там жа прайшоў першы год жыцця іх дачкі. Летась супрацоўнікі БДТУ, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, атрымалі арэндныя кватэры ў комплексе «Магістр» (квартале жылля, пабудаваным спецыяльна для дзеячаў навукі і культуры). У новай двухпакаёўцы Міхаіл з жонкай і дачкой адчуваюць сябе ўтульна, бо, пэўна, самае важнае пытанне маладой сям'і цяпер вырашана.

Амаль увесь свой вольны час Міхаіл прысвячае дачцэ і жонцы. А яшчэ піша вершы і складае... тэксты песень для аднаго з расійскіх рок-гуртоў.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Даследаванні па гэтай тэме — фактычна першыя ў Беларусі, дагэтуль ніхто ў нас не займаўся іх распрацоўкай. Вынікі можна лічыць унікальнымі для ўсёй постсавецкай прасторы.**

— Пра будучыню цяпер разважаць цяжка, — дзеліцца малады вучоны. — Кажуць, дрэнны салдат, які не марыць стаць генералам, і я кіруюся гэтым прынцыпам. Займацца навукай мне падабаецца, як і выкладаць. Таму развівацца збіраюся ў гэтым кірунку. У самых бліжкіх планах — напісанне доктарскай дысертацыі. Так, цяжкасці ёсць, але я не прыхільнік падыходу, калі людзі «скачуць» з месца на месца, шукаючы лепшай долі. Як той казаў, «нельга есці кашу дзвюма лыжкамі» ці «на двух крэслах не ўседзіш». Я мяркую, што трэба займацца адной справай. Усё складзецца само па сабе, калі прысвяціць жыццё таму, што любіш.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

# ПЕРШЫ РАЗ, ПЕРШЫ КЛАС...

Аляксей Казлоў неаднаразова працаваў у дзіцячых лагерах.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Кажуць, што ў вёсцы сумна. Але гэта не так, асабліва калі працуеш настаўнікам. Кожны дзень мяне весяляць дзеці. Адзін хлопчык, напрыклад, спрабаваў расказаць пра нашэсце «сяляна-славяна-манголa-татар», — з усмешкай прыгадвае Валянціна.

## Валейбольны бум

Генадзю Гапановічу ў якасці размеркавання прапаноўвалі працу ва ўніверсітэце, але ён адмовіўся. «Зарплата была б невялікая, а жыццё ў Мінску дарагое», — тлумачыць сваё рашэнне хлопец.

Цяпер ён настаўнік гісторыі і геаграфіі ў СШ №5 Слуцка. Перад першым верасня Генадзь не хваляваўся зусім, таму што, па-першае, загадзя паспеў пазнаёміцца з некаторымі будучымі вучнямі; па-другое, дырэктар гэтай школы раней быў дырэктарам у той, дзе вучыўся хлопец.

**І ўсё ж неяк Аляксею давялося паставіць першую ў сваім жыцці «двойку» вучню, які не проста не падрыхтаваўся да заняткаў, але і паказваў сваё нежаданне займацца ў класе.**

— Адзінае, што выклікала цяжкасці, — дакументацыя. Спачатку нават баяўся запаўняць журнал: думаў, што сапсую, але калегі дапамаглі і растлумачылі, што да чаго. Я ім вельмі ўдзячны за тое, што падказваюць мне, з якімі класамі трэба быць больш строгім, а дзе можна быць мякчэйшым.

Малады спецыяліст прызнаецца, што атрымлівае неверагоднае задавальненне, калі школьнікі сядзяць на ўроках з адкрытымі ратамі і ўважліва яго слухаюць.

— Я бачу, што вучні імкнуцца да мяне, хочуць пасябраваць, нават «фрэндзяць» у сацыяльных сетках. Даведаліся, што я ва ўніверсітэце займаўся валейболам, і цяпер у школе пачаўся «валейбольны бум» — ва ўсіх з'явілася жаданне ў яго гуляць, — кажа Генадзь і адразу ж знаходзіць тлумачэнне дзіцячай цікаўнасці: — Сярод настаўнікаў мала мужчын.

Валянціна Шэшка.

Працоўныя планы Генадзя не абмяжоўваюцца сценамі школы: у хуткім часе ён збіраецца вадзіць дзяцей пасля ўрокаў у кінатэатр на гістарычныя фільмы. Малады педагог ставіцца да сваёй працы з адказнасцю і праз два гады, калі абавязковая адпрацоўка скончыцца, уцякаць са школы не збіраецца: «Не проста ж так я ва ўніверсітэце вучыўся і выбраў менавіта гэтую прафесію!»

**«Я ва ўніверсітэце займаўся валейболам, і цяпер у школе пачаўся «валейбольны бум» — ва ўсіх з'явілася жаданне ў яго гуляць. Сярод настаўнікаў мала мужчын».**

— Зараз мяне перапаўняюць змяшаныя пачуцці. Шмат сяброў засталося ў Мінску, але ж і ў Слуцку я «свой чалавек», — разважае хлопец. — Вядома, у сталіцы ёсць шмат магчымасцяў для цікавага адпачынку, але, з іншага боку, я цяпер не студэнт, працую, вольнага часу ў мяне менш. Увечары настаўнік правярае сшыткі, рыхтуе планы ўрокаў.

## Першая двойка

Аляксей Казлоў выкладае фізіку ў 86-й мінскай школе і з'яўляецца класным кіраўніком 9 класа. Да працы са школьнікамі яму не прывыкаць: кожнае студэнцкае лета ён працаваў выхавальнікам у дзіцячых летніках.

— Свой прадмет я ведаю добра, мне лёгка праводзіць заняткі. А вось быць класным кіраўніком у 25 вучняў няпроста. Гэта патрабуе адказнасці і шмат увагі, з кожным неабходна працаваць індывідуальна.

Паколькі Аляксей старэйшы за сваіх навучэнцаў усяго на некалькі гадоў, ён адзначае, што маладому настаўніку вельмі важна адразу акрэсліць межы ў адносінах «школьнік—педагог». Неабходна цвёрда і адкрыта казаць пра гэта спачатку, інакш момант будзе ўпушчаны...

Фізіка — прадмет, які любяць далёка не ўсе, але хлопец сцвярджае, што гэта не праблема. «Зацікавіць фізікай можна нават гуманітарыя. Усё, пра што расказваю, падмацоўваю прыкладамі з жыцця, праводжу эксперыменты — дзеці любяць эфектнасць. На ўроку і ў тэматычныя гульні можна гуляць». І ўсё ж неяк Аляксею давялося паставіць першую ў сваім жыцці «двойку» вучню, які не проста не падрыхтаваўся да заняткаў, але і паказваў сваё нежаданне займацца ў класе.

**«Кожны дзень мяне весяляць дзеці. Адзін хлопчык, напрыклад, спрабаваў расказаць пра нашэсце «сяляна-славяна-манголa-татар», — з усмешкай прыгадвае Валянціна».**

— Калі я быў школьнікам, мяне вучылі людзі, якія скончылі ВНУ ў савецкі час ці ў першай палове 1990-х гадоў. Гэта былі настаўнікі з іншымі поглядамі на педагогіку, ды і на жыццё ў цэлым. Мы часта не маглі зразумець адно аднаго. У цяперашніх маладых настаўнікаў ёсць перавага: яны знаходзяцца на адной хвалі з дзецьмі, ім прасцей прыйсці да паразумення, — параўноўвае пакаленні малады спецыяліст і кажа, што стараецца не паўтараць памылак сваіх настаўнікаў.

Пра тое, што заробак невялікі, Аляксей пакуль не думае, зараз для яго галоўнае — набрацца досведу. Ён лічыць, што пры вялікім жаданні і настаўнік можа зарабляць шмат.

**Ганна КУРАК, студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Вачыма продкаў

# Праз церні ўбачыць даўнейшае

## Што такое Ведзьмерагіна і ці ёсць у нашай краіне свой Стоўнхендж?

**Адказы на гэтыя пытанні можна знайсці ў кнізе «Паміж небам і зямлёй: этнаастраномія». Яе аўтар — навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Цімафей АВІЛІН. У выданні ўпершыню ў гісторыі комплексна разглядаюцца традыцыйныя ўяўленні беларусаў пра астраномію. Карэспандэнту «Чырвонкі. Чырвонай змены» аўтар расказаў пра галоўныя асаблівасці народнага разумення космасу.**

***— Цімафей, адразу спытаю, пра што можна даведацца з кнігі?***

— Яна закранае ўсе аспекты ўспрымання беларусамі космасу. Я імкнуўся зрабіць выданне цікавым не толькі для навукоўцаў. Яго можна разглядаць і як навукова-папулярнае, і як энцыклапедыю. Можна чытаць спачатку, а можна адкрыць асобны артыкул і даведацца пра канкрэтнае сузор'е ці з'яву. Яшчэ адзін аспект магчымага выкарыстання — гэта сучасная інтэрпрэтацыя. Я спадзяюся, што сабраная інфармацыя стане падмуркам для развіцця тэмы ў мастацтве, дапаможа нашым пісьменнікам, мастакам.

***— А ці шмат адрозненняў у нашай этнаастраноміі ад класічнай еўрапейскай — старажытнагрэчаскай?***

— Памылкай будзе лічыць, што ў аснове сучаснай астраноміі ляжыць грэчаская міфалогія. Справа ў тым, што грэчаскае тлумачэнне гісторыі назваў сузор'яў было сфарміравана і ўведзена ў навуковы ўжытак толькі ў XIX стагоддзі на аснове тэкстаў толькі некалькіх антычных аўтараў. Але ж кожны народ выбудоўваў сваю міфалагічную сістэму, не выключэнне і Беларусь. Частка нашай астранамічнай міфалогіі заснавана на побытавых з'явах (Арыён — Касцы, Вялікая Мядзведзіца — Воз), частка — на біблейскіх уяўленнях (напрыклад, гісторыя Віфлеемскай зоркі, легенда пра Млечны шлях як разлітае святымі малако).

Мы маем з суседзямі шмат агульнага. Напрыклад, тэрмін «Ведзьмерагіна», якім на беларуска-літоўскім памежжы называюць Венеру, утвораны ад беларускага слова

Нават калі неба зацягнута аблокамі, кемлівы этнаастраном знойдзе выйсце.

**«Я імкнуўся змяшчаць максімальна дакладныя даныя, не міфалагізуючы нашу астраномію. Бо многае з таго, што мы ведаем пра беларускае разуменне космасу, штучна створана ў параўнальна нядаўнія часы».**

«ведзьма», і літоўскага «рагіна», што азначае... таксама «ведзьма». Такое вось узаемапранікненне.

Кожны народ успрымае начное неба праз прызму сваёй культуры, таму сабраныя намі звесткі па этнаастраноміі — гэта ўнікальны падмурак для навукоўцаў з самых розных сфер: моўназнаўства, этнаграфіі, фалькларыстыкі і іншых.

***— Па якіх крыніцах можна вывучаць «народную» астраномію цяпер?***

— У першую чаргу варта назваць экспедыцыйную дзейнасць. Старыя людзі ў вёсках дагэтуль памятаюць шмат цікавага па тэме. Я сам нярэдка збіраю пэўныя звесткі падчас паездак. Не менш важны і аспект дакументальных запісаў, нешта можна знайсці ў летапісах і іншых дакументах, нешта — у працах замежных калег.

Зазначу, што ўсе звесткі — дакументальна пацверджаныя. Я імкнуўся змяшчаць максімальна дакладныя даныя, не міфалагізуючы нашу астраномію. Бо многае з таго, што мы ведаем пра беларускае разуменне космасу, штучна створана ў параўнальна нядаўнія часы.

***— Напрыклад?***

— Скажам, тэрмін «Мілавіца», які часта ўжываюць у дачыненні да Венеры. Насамрэч беларусы так не казалі. Гэтую планету называлі па-рознаму: у першую чаргу — Заранкай ці Вечарніцай (з-за добрай бачнасці ранкам і ўвечары), Віфлеемскай зоркай, Звярыніцай, Воўчай зоркай, Мядзведзіцай, Дар'яй і Мар'яй, але ніколі — Мілавіцай. Ці ўзяць слова «знічка» — яго таксама не было да пэўнага часу ў нашай лексіцы ў такім значэнні. Знічкай называлі дзяўчыну, якая знікае і з'яўляецца ў іншым месцы.

Дарэчы, цікава, што некаторыя з гэтых міфаў становяцца рэальнасцю. Прыязджаеш у вёску, чуеш там ад кагосьці — «зорка Венера». Пытаешся, адкуль ведаюць такія словы, а табе ў адказ: «Дык так жа ў Багдановіча».

Ёсць і вельмі спрэчныя рэчы, з якімі я таксама паспрабаваў разабрацца. Напрыклад, наяўнасць старажытных беларускіх абсерваторый кшталту Стоўнхенджа. Некаторыя лічаць, што такія збудаванні знаходзіліся ва ўрочышчы Купа ў Аршанскім раёне і на возеры Янова каля Полацка, але сказаць, ці дакладна капішчы на гэтых месцах будаваліся ў астранамічных мэтах, немагчыма. У вёсцы Пашэвічы кажуць пра валун з лункамі, якія нібыта адлюстроўваюць частку зорак з сузор'яў Андрамеды і Касіяпеі, але гэта таксама цяжка пацвердзіць.

***— А ці была ў беларусаў свая астралогія?***

**«Частка нашай астранамічнай міфалогіі заснавана на побытавых з'явах (Арыён — Касцы, Вялікая Мядзведзіца — Воз), частка — на біблейскіх уяўленнях (напрыклад, гісторыя Віфлеемскай зоркі, легенда пра Млечны шлях як разлітае святымі малако)».**

— Калі казаць пра наша традыцыйнае яе ўспрыманне — са знакамі задыяка, па якіх можна вызначаць лёс, — то наўрад ці нашы продкі мелі такую сістэму. Але пэўныя элементы прадказання будучыні пры дапамозе зорак сустракаюцца. Скажам, у Веткаўскім раёне мне распавядалі пра бабак-павітух, якія пасля нараджэння дзіцяці выходзілі паглядзець на начное неба, каб прадказаць яго лёс. Як яны гэта рабілі, сказаць цяжка. Хутчэй за ўсё, сачылі за размяшчэннем самых яркіх зорак на небасхіле, наяўнасцю метэораў, гэта і ўказвала на будучыню нованароджанага.

***— Калі падагульніць, ці моцна наша традыцыйная астралогія адрозніваецца ад агульнапрынятай?***

— Так, гэта нават тэрміналагічна адсочваецца. Скажам, у нас не было спецыяльнага слова для абазначэння сузор'яў, у вёсках звычайна кажуць або «зорка», або «купка зорак», маючы на ўвазе іх групу. У літаратуры ўжываліся розныя тэрміны, нават лацінскія — «канстэлацыя», але «народнага» слова не было. Толькі ў пачатку мінулага стагоддзя з'явілася адпаведнае абазначэнне. Дарэчы, Вацлаў Ластоўскі прапаноўваў сваё слова — «спагвездзе», але ў мове замацавалася «сузор'е».

Ці ўзяць тую ж «зорку» — толькі на тэрыторыі Беларусі шырока ўжывалася тры тэрміны: «зорка», «звязда» і «гвязда».

Зазначу, што я ні ў якім разе не прапаноўваю замяніць усе існуючыя тэрміны ўласнабеларускімі. Але ведаць сваё — варта. Гэта як ведаць некалькі моў — любому чалавеку не зашкодзіць.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Што ні край...

# У ГАСЦЯХ У ЭТНАКАЗКІ

**Адправіцца ў такое падарожжа вам прапануе Сяргей Варонік. Некалькі гадоў таму хлопец скончыў факультэт турызму і сэрвісу Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, пасля працаваў у мясцовым турбюро. Там Сяргей і распрацаваў арыгінальны маршрут — «Падарожжа ў этнаказку», які палюбіўся беларускім аматарам вандровак і турыстам з розных краін свету. Не так даўно 25-гадовы юнак атрымаў за свой праект міжнародную прэмію «Садружнасць дэбютаў». Яна была заснаваная ў 2009 годзе з мэтай падтрымкі творчасці моладзі ў дзяржавах — удзельніцах СНД.**

— Праект наш міжнародны: ствараўся як беларусамі, так і палякамі, — расказвае хлопец. — Перад намі стаяла мэта павысіць прывабнасць трансгранічнага рэгіёна Гродзеншчыны. Праведзеная праца — плён супрацоўніцтва экскурсаводаў, гісторыкаў і краязнаўцаў. Кіраўнік праекта і мой ідэйны натхняльнік — дацэнт, кандыдат гістарычных навук Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Віталь Карнялюк — раздаў кожнаму заданні. Я вывучаў карту і знаходзіў на ёй цікавыя і нязведаныя мясціны са сваім непаўторным побытам.

Атрымаліся чатыры асноўныя маршруты: «Цуд народнага мастацтва», «Гасцінцамі Белуна», «Сотні гадоў разам: слядамі яўрэйскай культуры», «Дарогамі драўлянага дойлідства». Туры мабільныя, пры жаданні іх можна змяняць, як заўгодна. Пакуль выезд — толькі з Гродна. Але зараз я «перацягваю» экскурсіі і ў сталічную фірму, дзе працую. Хачу, каб больш людзей знаёмілася з нашай гісторыяй і культурай.

***— Чым адметныя твае «чароўныя» маршруты?***

— Мы робім акцэнт на этнакультуру. Самы папулярны маршрут — «Гасцінцамі Белуна». У беларускай міфалогіі ён — бог удачы, шчасця, поспеху, заступнік падарожнікаў. Паводле легенды, гэты сівавалосы, доўгабароды дзядок дапамагаў выйсці заблукаўшым вандроўнікам з цёмнага лесу. І сёння кажуць: «Цёмна ў лесе без Белуна».

**«Сёння мала проста здаць гасцям хатку, прапанаваць ім пайсці на рыбалку ці пакатацца на веласіпедзе. Трэба дапаўняць адпачынак культурнай праграмай, знаёміць гасцей з нашымі абрадамі і звычаямі, нацыянальнай кухняй».**

Слова «гасцінец» паходзіць ад старажытнаславянскага «госць» — падарожнік, іншаземны купец. Як вядома, беларусы заўсёды славіліся сваёй гасціннасцю і лагоднасцю. Гэта наш менталітэт. Прыгадайце, напрыклад, што дзверы ў хатах ў вёсках ніколі не замыкалі, а гаспадары з радасцю сустракалі кожнага мінака.



Нашу экскурсію па Гродне мы пачынаем з легенды. Потым ідзём глядзець Лідскі замак, Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, Адэльскі музей драўляных народных інструментаў. Дарэчы, у апошнім можна пазнаёміцца з музыкам Мар'янам Скрамблевічам. Ён не толькі сыграе, але і правядзе для ўсіх ахвотных майстар-клас.

***— На экскурсіях бываюць палякі, украінцы, расіяне, немцы... У чым сакрэт папулярнасці?***

— Мы знаёмім вандроўнікаў з аўтэнтычнымі промысламі і вясковым жыццём на Гродзеншчыне. Прыводзім туды, дзе захаваліся нацыянальныя звычаі і традыцыі. Нашы экскурсіі знаёмяць з сапраўдным беларускім побытам, у які можа акунуцца кожны ахвотны. Майстры навучаць каваць, ляпіць гаршкі, выразаць па дрэве. Пасля займальных урокаў мы запрашаем усіх пакаштаваць стравы нацыянальнай кухні. Ад нашых клёцак і дранікаў яшчэ ніхто не адмаўляўся!

Паралельна расказваем турыстам гісторыю краіны. Многія цікавяцца, як жылі на беларускіх землях раней. З дапамогай картаў і атласаў запаўняем адукацыйныя прабелы — атрымліваецца такое міні-падарожжа ў мінулае. Дарэчы, нашы прапановы па кашальку не б'юць, звычайна можна ўкласціся ў 300-400 тысяч рублёў. Адзначу, што сёння турысты больш патрабавальныя і пераборлівыя. Мала прывесці іх да нас — трэба зрабіць так, каб яны захацелі вярнуцца.

***— Але ж адной праграмы для гэтага недастаткова....***

— Варта пашыраць маршруты, раскручваць новыя цікавыя аб'екты. У Беларусі шмат аграсядзіб. Але сёння мала проста здаць гасцям хатку, прапанаваць ім пайсці на рыбалку ці пакатацца на веласіпедзе. Трэба дапаўняць адпачынак культурнай праграмай, знаёміць гасцей з нашымі абрадамі і звычаямі, нацыянальнай кухняй. За мяжой экскурсіі пабудаваныя на інтэрактыве, анімацыі, гульні. Напрыклад, турыстам паказваюць непрыглядны аб'ект, але пры гэтым маляўніча прэзентуюць яго гісторыю. Адным расповедам там не абмяжоўваюцца, цябе зацягваюць у «Спектакль», і ты літаральна трапляеш у падзеі далёкай эпохі. У нас шмат шыкоўных месцаў! Беларуская зямля — сапраўдная скарбніца легендаў, гісторый і міфаў.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Белпромтара», г. Минск, ул. Бабушкина, 22** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| Цех ширпотреба | Здание специализированное иного назначения | 283,4 кв.м | 110/С-87292 | Брестская обл., г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, д. 25Е/ 2 |
| Здание участка переработки дерева | Здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель | 559,1 кв.м | 110/С-91783 | Брестская обл., г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, 25 |
| Здание механического цеха | Здание специализированное иного назначения | 337,3 кв.м | 110/С-91788 | |
| **Составные части и принадлежности** | туалет, площадь – 4,55 кв. м | | | |
| **Сведения о земельном участке**: | Пл. 1,2605 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания участка переработки дерева, цеха ширпотреба, теплицы и здания механического цеха | | | |
| Буфет | Здание специализированное розничной торговли | 157,2 кв.м | 110/С-87252 | Брестская обл., г. Барановичи, пер. Водопроводный 2-й, 25 |
| Котельная | Здание специализированное иного назначения | 263,3 кв.м | 110/С-87257 | |
| Биллиардная | Здание специализированное иного назначения | 57,7 кв.м | 110/С-87265 | |
| Склад топлива | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 288,1 кв.м | 110/С-87273 | |
| Административно-бытовое здание | Здание административно-хозяйственное | 119 кв.м | 110/С-87279 | |
| Красный уголок | Здание специализированное иного назначения | 136,5 кв.м | 110/С-87291 | |
| Здание производственное | Здание специализированное иного назначения | 104,3 кв.м | 110/С-91789 | |
| Гараж | Здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) | 22,3 кв.м | 110/С-94176 | |
| **Сведения о земельном участке** | Пл. 0,5212 га предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания производственной базы | | | |

**Обременения**: частичная аренда зданий. Подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

А также пожарный водоём, ёмкостью 60,0 м³, инвентарный номер по бухучёту 71; камера сушильная модель КС-60 РЭ, инвентарный номер по бухучёту 556

**Начальная цена с НДС 20% – 7 067 866 800 белорусских рублей**

Разам з тым шырокі пералік медустаноў, што прапануюцца, дазваляе перастаць хвалявацца аб наяўнасці ў паліклініцы па месцы жыхарства таго ці іншага профільнага спецыяліста або дыягнастычнага абследавання — мы дапаможам трапіць да яго ў іншай установе».

Можна выбраць такую праграму, дзе будуць прадстаўлены толькі дзяржаўныя ўстановы аховы здароўя, або як дзяржаўныя, так і камерцыйныя. Базавыя праграмы прадугледжваюць таксама магчымасці атрымання толькі амбулаторна-паліклінічнай дапамогі або комплексны варыянт, які прадугледжвае атрыманне як амбулаторна-паліклінічнай дапамогі, так і стацыянарнай.

Добраахвотнае страхаванне медыцынскіх расходаў будзе зручным не толькі ў выпадку сітуацый, якія нельга прадбачыць — пры вострых захворваннях, але і пры наяўнасці хранічных станаў, якія

— Не сакрэт, што кошт некаторых відаў абследавання, такіх як камп'ютарная або магнітна-рэзанансная тамаграфія, застаецца досыць высокім. Але са страхавой кампаніяй гэта перастае быць праблемай».

Таксама страхавыя праграмы «Белэксімгаранта» дазваляюць забыцца пры наяўнасці паказанняў на праблему дарагіх лекавых сродкаў. Наогул, калі размова ідзе аб велізарных, часам проста непад'ёмных аднаразовых выплатах за абследаванне, лячэнне або некаторыя віды рэабілітацыі, то няма нічога больш зручнага, чым медстрахоўка.

«Страхавы выпадак — гэта любое парушэнне здароўя, абвастрэнне хранічнага захворвання, узнікненне вострага стану, траўма, — тлумачыць **вядучы спецыяліст аддзела медыцынскага і асабістага страхавання Белэксімгарант Вольга КАШЧЭНКА.** — Застрахаванаму чалавеку неабходна звярнуцца ў нашу кампанію па тэлефоне або электроннай пошце. Наш спецыяліст-урач адразу дае ўсе неабходныя рэкамендацыі. Тлумачыць, у якую з устаноў можна пайсці для вырашэння канкрэтнай праблемы

Вядучыя спецыялісты аддзела рэгулявання страт Вольга ГАЎРЫЛЬЧЫК і Жанна ВАЛЬКОВІЧ (злева направа).

са здароўем. Мы, са свайго боку, накіроўваем у гэтую ўстанову гарантыйнае пісьмо з гарантыяй аплаты пералічаных медыцынскіх паслуг. Гэтае пісьмо можа быць адпраўлена па факсе, электроннай пошце або выдадзена на рукі застрахаванай асобе. Цяпер ад яе патрабуецца дайсці да медустановы, звярнуцца там да спецыяліста-каардынатара, які па нашым званку ўжо запісаў пацыента на прыём, і прад'явіць яму страхавы поліс, імянную картку і пашпарт. Як толькі пацыент атрымаў паслугу, медустанова звязваецца з намі, а сам пацыент ні пра што больш не хвалюецца».

Алгарытм дзеянняў аднолькавы ў выпадках як планавай, так і экстраннай дапамогі, звязанай у тым ліку са шпіталізацыяй. Калі ёсць неабходнасць вызначыцца з аб'ёмам і характарам медыцынскіх даследаванняў, то спачатку застрахаваная асоба можа атрымаць кансультацыю ўчастковага тэрапеўта па месцы жыхарства.

## Камфорт — пад кантролем

Беларускае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства экспартна-імпартнага страхавання «Белэксімгарант» — адна з самых буйных у краіне дзяржаўных страхавых арганізацый. Філіялы адкрыты ва ўсіх абласных цэнтрах, а таксама ў васьмі буйных гарадах рэспублікі.

— Пасля заключэння дагавора добраахвотнага страхавання медыцынскіх расходаў паміж прадпрыемствам і нашай кампаніяй мы не толькі бяром на сябе пэўныя абавязкі, але і цалкам кантралюем аб'ём, тэрміны і якасць медыцынскіх паслуг, узровень камфорту і сэрвісу пры іх атрыманні, — падкрэслівае **начальнік упраўлення медыцынскага страхавання Белэксімгарант Вера СТАНЕВІЧ**. — Размова пры гэтым ідзе аб магчымасці кругласутачнага звароту, прыёме зваротаў урачамі вышэйшай і першай кваліфікацыйнай катэгорый.

**Генеральны дырэктар Белэксімгарант Генадзь МІЦКЕВІЧ:**

— Пятнаццаць гадоў работы кампаніі — наш велізарны ўнёсак у развіццё айчыннага страхавога рынку. Падчас работы з патэнцыяльнымі страхавальнікамі мы трымаемся таго прынцыпу, што нашы дасягненні ёсць вынік не толькі планамернай, паспяховай работы супрацоўнікаў кампаніі, але гэта яшчэ відавочны давер кліентаў. Таму, карыстаючыся святочнай нагодай, дазвольце падзякаваць як усім нашым работнікам, так і тым, хто лічыць нас надзейным партнёрам. Дзякуй, што давяраеце нам з году ў год, і загадзя дзякуй кожнаму, хто пажадае супрацоўнічаць з намі ў будучыні! Нашы спецыялісты адкажуць на любыя вашы пытанні ў любы час.

Святлана БАРЫСЕНКА, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ. Фота Надзеі БУЖАН.

УНП 101421509
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02200/13-00049 на права ажыццяўлення страхавой дзейнасці. Выдадзена Міністэрствам фінансаў РБ. Сапраўдны па 23 красавіка 2018 года.

■ Важнае пытанне

# ПРАКТЫЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ: ЦІ МАГЧЫМА ГЭТА?

**Структурныя рэформы ў Нацыянальнай акадэміі навук, скіраваныя ў першую чаргу на павышэнне практычных вынікаў працы ўстановы, пачаліся з прыродазнаўчых падраздзяленняў. Цяпер надышла чарга гуманітарных. Але калі накіраваць у практычны бок, напрыклад, фізіку ці эканоміку, здаецца, не так цяжка, то што рабіць з навукамі аб чалавеку? Першыя вынікі стварэння практыкаарыентаваных цэнтраў (так званых кластараў) у гуманітарных установах можна было ацаніць падчас нядаўняй Другой міжнароднай навуковай канферэнцыі «Інтэлектуальная культура Беларусі: кіраванне ведамі ў кантэксце задач сацыяльна-эканамічнай мадэрнізацыі», што прайшла ў Інстытуце філасофіі НАН.**

Удзел у форуме ўзялі дзясяткі навукоўцаў і экспертаў з Беларусі, Казахстана, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны. Сярод іх былі як навукоўцы-філосафы, так і прадстаўнікі органаў дзяржкіравання, сістэмы адукацыі, дзелавых кругоў, буйных прадпрыемстваў. Агульная задача канферэнцыі фармулявалася наступным чынам: суаднесці інтэлектуальны капітал краіны з рэальным досведам кіравання ведамі і кампетэнцыямі.

На гэтым сканцэнтраваў увагу ў сваёй прамове **акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Аляксандр КАВАЛЕНЯ.** Па яго словах, цяпер перад краінай стаіць задача не толькі тэхнічнай мадэрнізацыі, але і ўдасканалення кіравання чалавечым капіталам. Дзеля гэтага акадэмік прапанаваў стварыць па выніках канферэнцыі працоўную групу, якая занялася б унясеннем прапаноў у міністэрствы і ведамствы краіны (у першую чаргу — у Міністэрства адукацыі), Адміністрацыю Прэзідэнта, Нацыянальны сход.

Варта сказаць, што прамовы выступоўцаў на адкрыцці канферэнцыі падзяляліся на дзве часткі. Мерапрыемства пачалося з выступлення **дырэктара Інстытута філасофіі акадэміі навук Анатоля ЛАЗАРЭВІЧА.** Ён распавёў пра дзейнасць кластара, створанага на базе інстытута — Рэспубліканскага цэнтра фундаментальнай і практычнай філасофіі.

**Загадчык кафедры філасофіі і метадалогіі навукі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Анатоль ЗЕЛЯНКОЎ** у сваю чаргу выказаў пэўную заклапочанасць магчымымі перагібамі пры пераарыентацыі філасофіі ў бок практыкі. «Няма нічога больш практычнага за добрую тэорыю», — прывёў навуковец цытату, якую прыпісваюць розным асобам.

Пытанні кіравання інтэлектуальнымі рэсурсамі ва ўмовах сеткавага грамадства і інтэграцыйных працэсаў закранула **дырэктар Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Ядвіга ЯСКЕВІЧ.** Асабліва яна звярнула ўвагу на захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці падчас глабалізацыі.

Кантрасна на гэтым фоне выглядалі выступленні спецыялістаў-практыкаў, што спыніліся на асноўных праблемах, з якімі сутыкаюцца ў сваёй працы іх прадпрыемствы. **Дырэктар па персанале групы кампаній «Алютэх» Аляксандр МУДРЫК** скіраваў увагу слухачоў на галоўныя праблемы, у вырашэнні якіх можа дапамагчы акадэмічная навука.

Паводле слоў спецыяліста, асноўнае, чаго не стае беларускім кампаніям цяпер, — гэта якасныя чалавечыя рэсурсы, ад якіх можна было б атрымліваць максімальную аддачу. Сярод аспектаў працы HR-аддзелаў ён вылучыў непасрэдна прыцягненне і ўтрыманне спецыялістаў высокага ўзроўню, стварэнне HR-брэндаў («кампаніі, у якіх хочацца працаваць»), стварэнне ўласных сістэм рэкрутынгу буйнымі прадпрыемствамі. Асабліва дэтальна абмяркоўвалася апошняе. Па меркаванні Аляксандра Мудрыка, выпускнікі беларускіх ВНУ абсалютна не адпавядаюць высокім стандартам вялікіх кампаній. З гэтай прычыны прадпрыемствы ствараюць свае навучальныя ўстановы і праграмы, як, напрыклад, «Алюстарт» у кампаніі самога Аляксандра. За два тыдні суіскальнікі праходзяць поўную перападрыхтоўку па сваёй будучай спецыяльнасці з ухілам на фарміраванне канкрэтных здольнасцей.

Спецыяліст звярнуў увагу і на падрыхтоўку студэнтаў па асобных спецыяльнасцях. «Эфектыўнаму менеджменту павінны навучаць тыя, хто ім займаецца, а не тыя, хто прачытаў па тэме шмат літаратуры, — зазначыў Аляксандр Мудрык. — У сённяшніх умовах усё вельмі хутка змяняецца, і ніякія кнігі не заменяць уласны досвед. На жаль, сярод універсітэцкіх выкладчыкаў доля практыкуючых менеджараў складае каля 7%».

Галоўны трэнд у сучасным падборы персаналу, па меркаванні Аляксандра Мудрыка, звяртанне ўвагі не на працоўны вопыт ці інтэлект, а на патэнцыял магчымага супрацоўніка. Ці ёсць у работніка здольнасць хутка асвойваць новае? Ці можа ён гнутка адаптавацца да новых умоў? Ці здольны выконваць новыя ролі? Гэтыя пытанні для сучасных «рэкрутараў» становяцца асноўнымі. Матываця, цікаўнасць, праніклівасць, уменне пераконваць, мэтанакіраванасць — галоўныя пункты ацэнкі суіскальніка. Аднак сістэма патрабуе больш дакладнай і глыбокай методыкі выяўлення найлепшых. Менавіта ў гэтым, на думку Аляксандра Мудрыка, заключаецца галоўная задача акадэмічнай навукі.

Прыкладна ў такім жа кірунку выступіў іншы спецыяліст-практык — **бізнес-трэнер, кансультант, дырэктар цэнтра падрыхтоўкі ІТ-спецыялістаў «QA Акадэмія» Юрый АНУШКІН.** Па яго словах, калі сённяшняя сітуацыя будзе працягвацца, то ўжо ў самай блізкай перспектыве спецыялізаваныя адукацыйныя ўстановы, створаныя ў тым ліку і пры асобных прадпрыемствах, змогуць перацягнуць суіскальнікаў да сябе. Менавіта выступленні двух апошніх спецыялістаў выклікалі найбольшы рэзананс і сталі каталізатарам актыўнага абмеркавання.

Ці змогуць практыкі і тэарэтыкі паразумецца, а акадэмічная навука дапамагчы эканоміцы краіны? Адказ на гэтыя пытанні мы, відаць, атрымаем у найбліжэйшыя часы.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■

■ Ведай нашых!

# БЫЎ. ЁСЦЬ. БУДЗЕ

**У Віцебску ўручылі літаратурную прэмію аблвыканкама імя Уладзіміра Караткевіча і ўганаравалі пераможцаў маладзёжнага конкурсу.**

— Прэмію імя Уладзіміра Караткевіча за ўсе гады яе існавання атрымалі больш за 20 чалавек. І сярод іх не толькі літаратары, а і работнікі культуры, адукацыі. Лаўрэатамі сталі і калектывы аршанскага музея Караткевіча, віцебскай бібліятэкі, якая носіць яго імя... У абласным літаратурным конкурсе сярод моладзі «Быў. Ёсць. Буду...» бралі ўдзел больш за 500 школьнікаў, студэнтаў, хлопцаў і дзяўчат, якія ўжо працуюць, — распавядае **старшыня Віцебскага абласнога аддзялення «Саюза пісьменнікаў Беларусі» Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА.** — У выніку журы вызначыла каля 30 пераможцаў. А 20 творчых работ было адзначана падзякамі.

Адным з лаўрэатаў літаратурнай прэміі ў намінацыі «проза» стаў **Ігар ПРАКАПОВІЧ.** Ён выкладае ў гімназіі №1 Пастаў, кіруе навуковым краязнаўчым таварыствам.

— Над выданнем «Чароўны край — Пастаўшчына» я працаваў больш за 30 гадоў. Яго асаблівасць у тым, што ёсць яшчэ і сшытак па курсе «Паставызнаўства». У камплект таксама ўваходзіць дыск з прэзентацыямі краю. Там шмат фотаздымкаў, якія зрабілі лепшыя пастаўскія фатографы, — расказаў лаўрэат.

У Віцебскім лялечным тэатры паводле твораў Караткевіча пастаўленыя тры спектаклі. Тэатр «Лялька» стаў лаўрэатам за прапаганду жыцця і творчасці Уладзіміра Сямёнавіча.

— «Ладдзя роспачы» — гэта шэдэўр. Ды ўсё, што напісаў Уладзімір Сямёнавіч — геніяльна! Мы пастараліся, каб Караткевіч «загаварыў» на «лялечнай мове». Упэўнены, у нас гэта атрымалася! — эмацыянальна падкрэсліў **Віктар КЛІМЧУК, мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра «Лялька».**

Калі ён распавядаў пра творчыя пошукі падчас пастановак па Караткевічу, нагадаў ягоныя словы: «І калі ты не стварыў такой песні ў гонар Радзімы і волі, вайны і любові, то шэлег табе цана, і лепш бы табе ніколі не быць паэтам. Такіх хопіць і без цябе».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■

■ Свой погляд

# ДАЙЦЕ МУЖЧЫНАМ БЫЦЬ МУЖЧЫНАМІ!

**«Няма сапраўдных мужчын...» — гэтае галашэнне чуецца ў разнастайных варыяцыях. Сапраўдны мужык звёўся, здрабнеў, змізарнеў, і пара яго занесці ў Чырвоную кнігу — побач з вяртлявай чаротаўкай і даўгахвостым лімнакалянусам. Так, жанчыны часам празмерна крытычныя да нас, мужчын. Але ў гэтым выпадку мушу прызнаць горкую праўду: моцная палова чалавецтва ў наш час не такая ўжо і моцная. Высакародныя рыцары без страху і заганы, мужныя і адначасова пяшчотныя, засталіся на зашмальцаваных старонках старасвецкіх раманаў.**

Але на ўсё ёсць прычына. І мужчынская бязвольнасць або эгаізм — гэта не проста праява суб'ектыўных рыс характару. Ёсць і аб'ектыўныя абставіны, якія заахвочваюць мужчын паводзіць сябе менавіта так, а не інакш. Вось чаму, напрыклад, у жырафы вырасла такая доўгая шыя? Каб пад'ядаць лісце з верхніх галінак. А чаму крот амаль сляпы? Бо пад зёмлёй ад тых вачэй толку, як ад кажуха ў лазні. Арганізмы так ці інакш прыстасоўваюцца да навакольных умоў. Нешта набываюць, нешта страчваюць.

Штосьці падобнае адбываецца і ў грамадстве. У кожную эпоху запатрабаваны пэўны тып чалавека. Некалі ідэалам лічыўся суровы мужык, які і зямлю ўзараць можа, і чарговым шведа-манголам даць прачуханца. Мужчыны, на якіх скардзяцца сучасныя паненкі, — таксама прадукт эпохі. І залежыць якасць гэтага «прадукту» ад тых патрабаванняў, што да яго прад'яўляюцца. У тым ліку з боку жаночай супольнасці.

На словах дзяўчаты, вядома, чакаюць рыцараў. І бясконца вывешваюць у сацыяльных сетках пафасныя допісы пра Сапраўднага Мужчыну. Мужнага, абаяльнага, шчодрага, вернага, разумнага, багатага: Ален Дэлон, Брэд Піт і Біл Гейтс у адным флаконе. Але па жыцці жанчыны дэманструюць зусім адваротнае — цярплівасць і непатрабавальнасць.

У гэтым я пераканаўся ў юнацтве. Кветкі, вершы, зоркі з неба — такі стандарт адносін з дзяўчатамі некалі здаваўся мне адзіна магчымым. Але навучанне на гуманітарным факультэце развеяла ілюзіі. Факультэцкія «камсамолкі, спартсменкі і проста прыгажуні» часцяком мелі за кавалераў такіх «персанажаў», што ажно дрыжыкі бралі. Высветлілася, што пры сваёй дзяўчыне можна сыпаць мацюкамі, бы гарохам. А таксама мацаць яе за «апетытныя» месцы пасярод вуліцы. І не тэлефанаваць тыднямі... Не, я нікога не асуджаю. Сам не анёл. Але ж як гэтыя дзявочыя цярплівасць і некрытычнасць ужываюцца з марамі аб «прыўкрасным прынцу»? Дзе логіка?

**«Сапраўдны мужык», па якім уздыхаюць паненкі і кабеты, — ён звычайна «нязручны». Ён забяспечвае сям'ю, здольны самастойна прымаць рашэнні і быць той самай «каменнай сцяной». Але ёсць і «пабочныя эфекты».**

Зрэшты, добрыя дзяўчаты часта любяць кепскіх хлопцаў. Закон прыцягнення супрацьлегласцяў. Але і з узростам паненкі не становяцца больш пераборлівымі. Наадварот, пару разоў «апёкшыся», жанчына разважае, што «лепей хоць які мужык, чым ніякага». Вось і жывуць з «хоць якімі». Гадамі церпяць ад іх п'янства, пабоі, зняважі і іншыя праявы неадэкватнасці. І бездапаможна разводзяць рукамі: «У нас жа дзеці...», «Не хочацца сям'ю разбураць...» Хоць мне бачыцца іншая прычына — падсвядомая боязь страціць свайго «хоць якога». І гэта прымушае наступіць на горла ўласнай годнасці і гонару.

Ёсць меркаванне, што ўся бяда ў гендарным перакосе. У адрозненне ад краін Захаду, жанчын у нас болей, чым мужчын. Немка ці якая шведка можа дазволіць сабе выйсці з дома без макіяжу і ў падкрэслена асэксуальным адзенні. Нашыя жанчыны нават у краму ходзяць на абцасах і з падведзенымі вуснамі. І ў гэтым бачыцца не толькі эстэтыка. У нас дамы вымушаныя канкураваць паміж сабой за кавалераў, а не наадварот. Таму ў мужчын няма стымулу ўласную мужчынскасць развіваць.

А яшчэ гэтая самая мужчынскасць змалку душыцца немужчынскім выхаваннем. Сістэма школьнай адукацыі даўно стала наскрозь жаночай. Нічога не маю супраць педагогаў-жанчын. Але яны самі прызнаюць, што мужыкоў школе катастрафічна нестае. (Чаму так сталася — асобная гаворка.) Зрэшты, застаецца сям'я, дзе павінна быць цвёрдая бацькава рука. Але «павінна» — не значыць «ёсць». У наш час сямейныя супярэчнасці ўсё часцей вырашаюць разводам, калі дзеці застаюцца з маці. І трэба аддаць належнае жанчынам: многія з іх здольныя самастойна забяспечыць дзяцей. Затое ўзнікае рызыка распесціць хлопчыка празмернай апекай. Спачатку за яго думае мама, пасля — жонка. А калі жонка раптам кідае небараку, ён не ведае, што яму рабіць і як жыць далей. Дарослы саракагадовы «хлопчык»...

Дый у поўных сем'ях мужчына ўсё часцей — рахманы працоўны «конік» ці разнавіднасць «мэблі». А мама прымае «камандаванне» на сябе. І дзеці засвойваюць менавіта такую мадэль сямейных адносін. Мама цягае каструлі з баршчом сваім дарослым дзецям. Мама знаходзіць ім мужоў-жонак. Мама іх пасля і выганяе. Мама вырашае, як выхоўваць унукаў. «Прадукт» мамчынага выхавання — тое самае пакаленне распешчаных, бязвольных, слабахарактарных мужчын. Мужчын, якіх з маленства вучылі, што галоўнае — гэта паслухмянасць. Такі мужчына прадказальны, паддаецца кантролю, увогуле зручны ў «эксплуатацыі». Але не варта чакаць ад яго рашучасці ў складаных сітуацыях і нейкіх сапраўдных учынкаў.

А «сапраўдны мужык», па якім уздыхаюць паненкі і кабеты, — ён звычайна «нязручны». Ён забяспечвае сям'ю, здольны самастойна прымаць рашэнні і быць той самай «каменнай сцяной». Але мае «пабочныя эфекты» ў выглядзе любові да машыны, рыбалкі, сяброўскіх пагулянак, футболу і г.д. І ўласных думак.

Мужчынам трэба даваць быць мужчынамі. Змалку дазваляць ім быць самастойнымі. І патрабаваць ад іх. Вучыць прапускаць наперад дзяўчат. Саступаць месца бабулям. Насіць маміны сумкі з крамы. Абараняць сябе і тых, хто побач... І не трэба няньчацца з хлопчыкамі да іх саракагоддзя. Інакш у Чырвонай кнізе адной-чы сапраўды давядзецца зрабіць новы запіс — «Мужчына Сапраўдны»...

**Валянцін БОЙКА**

■

Брыянтэ МЕНДОСА:

# «Чалавек не маральны і не амаральны, чалавек — і ёсць мараль»

**Разабрацца ў паняцці «мастацтва кіно» — тое ж самае, што знайсці сэнс жыцця. Але ж калі пошукі сэнсу жыцця ніколі не спыняліся, то і спробы зразумець, у чым заключаецца сутнасць мастацтва кіно і яго адрозненне ад кінапрадукту, маюць права на існаванне.**

**У гэтых пошуках да нас далучаюцца людзі са свету кінематографа. Яны раскажуць пра сваю працу, сваё бачанне кіно, пра метафізічнае і рэальнае, пра сусветнае і вузкасацыяльнае, пра важнае і банальна простае. І таксама, як пасля добрага кіно мы становімся іншымі людзьмі, магчыма, гэтыя інтэрв'ю дапамогуць нам аддаліцца ад нязручных сацыяльных умоўнасцяў.**

**Філіпінец Брыянтэ Мендоса, можна сказаць, стаў рэжысёрам выпадкова. Калі яму было 44 гады, на прапанову стварыць фільм ён падумаў «Чаму б і не?». І з тых часоў здымае прыкладна па дзве карціны ў год. У выніку са сваімі працамі Мендоса стаў частым госцем на Канскім кінафестывалі, дзе ў 2009 годзе за фільм «Бойня» атрымаў узнагароду як найлепшы рэжысёр, а ў 2015-м за карціну «Пастка» — прыз экуменічнага журы. На пазамінулым Мінскім кінафоруме «Лістапад» Брыянтэ Мендоса прадстаўляў сваю карціну «Чэрава тваё» пра бясплодную жанчыну з племені Таві-Таві, што для свайго мужа шукае жонку, здольную нарадзіць дзіця.**

Рэжысёра называюць ультранеарэалістам. І сапраўды, на рэалістычнасць ён робіць стаўку, часта выкарыстоўваючы элементы дакументалістыкі. Напрыклад, у карціне «Чэрава тваё» былі зняты сапраўдныя роды. Яго фільмы — у першую чаргу пра чалавека, яго ўстаноўка — адлюстроўваць на экране навакольную рэальнасць. Так Мендоса пераняў для сябе прынцып «Found story», гэта значыць прынцып знойдзенай гісторыі, які прадугледжвае наяўнасць рэальнага чалавека з рэальнымі перажываннямі, праз якія рэжысёр пачынае пазнаваць праблему.

**«Падчас здымак у мяне ніколі не бывае дакладных установак, мы робім шмат спантанных рэчаў, імправізуем, таму да мантажу прыходзім з нявызначанасцю і хваляваннем».**

Мендоса выпрацаваў свае метады працы над рэалістычнасцю, у якіх галоўныя ролі выконваюць камера, гук і акцёры. Камера заўсёды ў руху і пазбягае статычнасці, часам сваёй «неспакойнасцю» яна адлюстроўвае атмасферу саміх падзей, яна сочыць, менавіта сочыць за чалавекам ці ўвогуле быццам адсутнічае, настолькі арганічна незаўважным здаецца гэта назіранне. Рэжысёр гаворыць, што шумы на Філіпінах асаблівыя ў параўнанні з іншымі месцамі, таму мікрафоны запісваюць гукі навакольля, да якіх можна прыслухацца падчас прагляду фільмаў. А акцёры, як прафесійныя, так і непрафесійныя, працуюць на здымачнай пляцоўцы без дакладнага сцэнарыя — менавіта пражываюць іншае жыццё перад камерай. Нягледзячы на такі прынцып працы, аўтар кажа, што не робіць шмат дубляў, бо акцёры, што ўжыліся ў роль, думаюць і адчуваюць сябе так жа, як тыя, каго яны іграюць. Таму няправільных слоў ці жэстаў быць не можа. Франсуа Трюфо і братоў Дардэн Мендоса называе любімымі рэжысёрамі, што цалкам лагічна з іх агульнай любоўю і ўвагай да звычайнага чалавека.

Карціна аўтара «Пастка», што паказвалася ў рамках майстар-класа на сёлетнім кінафестывалі «Лістапад» (гэта быў другі візіт Брыянтэ на Мінскі кінафорум, і магчымасць трэцяга рэжысёр не выключае), ствараласяз бескарыслівай дапамогай вялікай колькасці жыхароў філіпінскага горада Таклабан, што пацярпеў ад аднаго з самых моцных тайфунаў у гісторыі метэаназіранняў. Можна толькі выказаць здагадку аб тым, наколькі гэта важны праект для саміх філіпінцаў, бо фільм прама і шчыра распавядае пра боль тых, хто страціў дзяцей, бацькоў ці сужэнца. Але ёсць у Брыянтэ Мендосы карціны, не звязаныя відавочна з перажываннямі вялікай колькасці суайчыннікаў. Напрыклад, неадназначны фільм «Сербіс» пра порнакінатэатр ці тая ж «Бойня», за якую аўтар атрымаў узнагароду Канскага кінафестывалю. Я запыталася ў Брыянтэ, як гэтыя і іншыя карціны былі ўспрыняты на радзіме.

— Я магу сказаць, што філіпінцы ўспрынялі мае карціны, але не магу сказаць, што ўспрыняў іх масавы глядач. У краіне ведаюць мяне і мае работы, прызнаюць як рэжысёра з сусветным імем, але тут усё яшчэ больш папулярныя рамантычныя камедыі, галівудскія блокбастары і філіпінскі мэйнстрым. Нават мая апошняя работа «Пастка» насамрэч не так шырокавядомая і папулярная, якой магла б быць.

**«Каб стварыць фільм, трэба выпрацаваць, акрамя эстэтыкі і ўсяго, што тычыцца візуальнага рада, уласнае стаўленне да знойдзенай гісторыі».**

***— Гэта традыцыйныя суадносіны паміж масавым і аўтарскім кіно. Вы неяк казалі, што рэалістычнасці ў кіно дасягнуць даволі складана. Стварэнне новай рэальнасці перад камерай — апрыёры працаёмкі працэс. А ў чым складанасць з рэалістычнасцю?***

— Мае фільмы расказваюць пра рэальныя падзеі, што мы знаходзім і па якіх праводзім даследаванне, якія падрабязна разбіраем і потым на аснове гэтай працы пішам сцэнарый. Прынцып знойдзенай гісторыі вельмі складана сумясціць з тым, як распавядаецца гэта гісторыя, з тым, як пішацца гук, як складваецца карцінка і гэтак далей — складана сумясціць рэалістычную гісторыю з кінематаграфічнымі метадамі апавядання.

***— Раскажыце як кіраўнік працэсу, як павінен працаваць аператар, якія ўстаноўкі прымаюць акцёры, чым насычаецца матэрыяльнае асяроддзе, якімі якасцямі надзяляюцца персанажы, каб дасягнуць гэтай рэалістычнасці?***

Кадр з фільма «Чэрава тваё».

— Каб стварыць фільм, трэба, акрамя эстэтыкі і ўсяго, што тычыцца візуальнага рада, ужо ў працэсе даследавання выпрацаваць уласнае стаўленне да знойдзенай гісторыі, што дапаможа самому працэсу і знаходжанню вялікага аб'ёму матэрыяла. Думаю, далёка не ўсе рэжысёры ад моманту знаёмства з ідэяй да пачатку здымак выпрацоўваюць свае адносіны і праводзяць даследаванне. Напрыклад, я рэзка негатыўна стаўлюся да любой несправядлівасці, ці то ў адрас жанчыны, ці то ў адрас старога чалавека, і рэагую на гэта — у цэнтры фільма павінна быць праблема, якая будзе мяне асабіста глыбока хваляваць. Самы складаны этап пачынаецца, калі трэба сумясціць гісторыю з даследаваннем, а ўсё гэта, у сваю чаргу, суаднесці з маім стаўленнем да сюжэта. Па вялікім рахунку, сцэнарый для фільма з'яўляецца Бібліяй, таму гэты этап ёсць напісанне Біблії. Ва ўмоўную скрынку я складваю гісторыю, даследаванне, веды, адносіны, сілы, эмоцыі, каб склаўся сцэнарый. Калі пачынаецца камандная праца, мне важна, каб хаця б 50% са складу групы адчувалі ў дачыненні да гісторыі тое ж, што адчуваю я, каб мы працавалі практычна як сям'я. А працэс здымак — самы просты этап: ты як у школе пасля доўгай вучобы і выканання дамашняй работы толькі прымяняеш тое, што некалі вывучыў, на практыцы і здаеш экзамен. З экзаменам, які можа доўжыцца гадзіну ці менш, ты лёгка спраўляешся пры ўмове, што добра працуеш год да яго. Яшчэ адзін складаны этап — мантаж, падчас якога трэба з усяго адзнятага матэрыялу зрабіць фільм. У гэты момант усё залежыць ад таго, як ты адказваў на экзамене. Тут для мяне і здараецца сапраўдная магія: падчас здымак у мяне ніколі не бывае дакладных установак, мы робім шмат спантаных рэчаў, імправізуем, таму да мантажу прыходзім з нявызначанасцю і хваляваннем. З адзнятага матэрыялу ствараецца гісторыя, і мы самі не ведаем, ці будзе яна такой, якой мы яе ўяўлялі.

***— Вы здымаеце ў сярэднім два фільмы штогод. Гэта насамрэч вельмі прадуктыўна, у чым сакрэт?***

— Мне вельмі падабаецца мой занятак, я нават не магу назваць яго працай.

***— Вашы фільмы аб простых людзях, іх праблемах, жыцці. Нейкім чынам сваімі карцінамі вы рэагуеце на несправядлівасць, на хібы навакольнага свету. Гэтая праца-задавальненне робіцца ў першую чаргу для сябе ці для іншых?***

— Я атрымліваю задавальненне ад сваёй працы, але, вядома ж, не атрымліваю задавальнення ад таго, што людзі пакутуюць. Гэта мой абавязак як мастака — паказваць тое, што я бачу, таму што ў мяне ёсць для гэтага магчымасці і сілы. Галоўная мэта для мяне — дамагчыся сваімі карцінамі пэўных змен. Я разумею, што гэта далёкая і складаная перспектыва, але вельмі хацелася б, каб нашы фільмы некалі нешта змянілі.

**Мендоса пераняў для сябе прынцып «Found story», гэта значыць прынцып знойдзенай гісторыі, які прадугледжвае наяўнасць рэальнага чалавека і яго рэальных перажыванняў.**

***— Што дакладна вы маеце на ўвазе?***

— Праблем заўсёды шмат, яны былі і будуць. Зразумела, што мы не зможам вырашыць іх усе, але я раблю свой крок (і заўсёды буду яго рабіць) дзеля таго, каб калі-небудзь прыйсці да гарманічнага грамадства, у якім камфортна знаходзіцца і жыць.

***— Ёсць такая кінематаграфічная формула, якая кажа, што прысутнасць Бога ў фільмах Дрэера ўказвае на яго прысутнасць, адсутнасць Бога ў Бунюэля — на яго адсутнасць, у Феліні — прысутнасць Бога ўказвае на яго адсутнасць і наадварот у Бергмана. У вашых карцінах таксама ёсць Бог. У якіх праявах?***

— Для мяне Бог там *(паказвае ўгору)*, што б ні здарылася. Але ён ёсць тут, калі чалавек у гэтай канкрэтнай сітуацыі хоча, каб ён быў. Я дакладна сказаў пра гэта ў фільме «Сербіс» — чалавек не маральны і не амаральны, чалавек — і ёсць мараль. Так і ад самога чалавека залежыць прысутнасць і адсутнасць Бога.

***— Ёсць прадукт кіно, ёсць мастацтва кіно. Што для вас менавіта сапраўднае мастацтва кіно?***

— Для мяне мастацтва праяўляецца яшчэ ў працэсе, то бок стварэнне твора мастацтва і вопыт, які ты атрымліваеш, — і ёсць мастацтва. Фільм аказваецца прадуктам, калі ствараецца дзеля таго, каб проста быць, а мастацтвам, калі ты ўкладваеш у яго тое, праз што табе прыйшлося прайсці, і пражываеш кожны момант свайго твора.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*


**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ: 04 января 2016 г. в 11.00 состоятся открытые аукционные торги (торги) по продаже имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Бобруйскстранс» (продавец), в составе:**

**Лот № 1 (предмет торгов): Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-42432 (профилакторий для ремонта автомобильных шин), общей площадью 396,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181**

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509, ОКПО 55484006, 220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369 |
| **Продавец предмета торгов** | Открытое акционерное общество «Бобруйскстранс», УНП 700169542, ОКПО 291215757, 213830, г. Бобруйск, ул. Минская, 123/1, р/с 3012420021026 в ОАО «Белинвестбанк» ЦБУ № 831 г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, код 739, р/с 3012259270013 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458 |
| **Место проведения торгов и подачи документов** | ул. Чонгарская, д. 54 , г. Бобруйск, в здании Бобруйского управления Филиала «Центр «Белтехинвентаризация» в рабочие дни с 8.30 до 17.30 |
| **Начальная цена продажи и размер задатка** | **880 000 000 рублей с учетом НДС, задаток 10% от начальной цены – 88 000 000 рублей** |
| **Номер расчетного счета для перечисления задатка** | **Получатель платежа –** Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, УНП 102353509 |
| **Информация о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 741000000007002243 пл. 2,6457 га расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Гоголя, 181. Имущественные права на земельный участок – право постоянного пользования. Земельный участок для обслуживания предмета торгов будет выделен после приобретения объекта с торгов согласно Законодательству Республики Беларусь. |

| | |
|---|---|
| **Характеристика предмета торгов** | Здание профилактория для ремонта автомобильных шин – одноэтажное кирпичное,1980 г.п., фундамент – кирпич.., перекрытия – ж/бет.; кровля – рулонная, полы – бетонные, имеется электроснабжение |
| **Условия продажи предмета торгов** | 1. При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20%, который необходимо перечислить на р/с ГУ МФ Республики Беларусь по Могилевской области № 3602917010008 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код 795, УНП 700005949, назначение платежа 01001 за ОАО «Бобруйскстранс», УНП 700169542<br>2. Здание реализуется под контролем судебного исполнителя<br>3. Денежные средства, причитающиеся от реализации объектов без учета НДС, перечисляются на счет ОАО «Бобруйскстранс» № 3012259270039 в РКЦ № 24 ОАО «Белагропромбанк» г. Бобруйск, ул. Горького, 1, код 458, УНП 700169542 |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | В течение 20 (Двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов |
| **Сроки и условия оплаты** | Определяются по согласованию победителя торгов (претендента на покупку) с продавцом при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | по 29 декабря 2015 г. включительно до 17.00 |

**Для участия в торгах лица, заявившие о своем участии в них, должны предоставить по указанному адресу следующие документы:** заявление на участие в торгах; копию платежного поручения о внесении участником торгов суммы задатка с отметкой банка об исполнении, паспорт; **для резидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – доверенность представителю юр. лица (в случае необходимости таковой), копии и оригиналы учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; **представителям физ.лиц** – нотариально заверенную доверенность; **для нерезидентов Республики Беларусь: юр. лицам** – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее чем за 6 мес. до подачи заявления на участие в торгах) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; **юр. лицам и физ. лицам** – документ о состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорус.(рус.) язык; **представителям юр. лиц и физ. лиц** – легализованную в установленном порядке доверенность.

**Порядок проведения торгов: Шаг аукциона определяется в размере от 5 до 15 процентов от начальной цены предмета торгов. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. По завершении торгов составляется протокол об итогах проведения торгов, который подписывается победителем и членами аукционной комиссии и является основанием для заключения договора купли-продажи. В случае, если заявка на участие в торгах подана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.** Задаток, внесенный Победителем торгов будет зачтен в счет оплаты стоимости услуг Организатора торгов, разница между задатком и суммой стоимости услуг будет зачислена в счет окончательной оплаты приобретенного предмета торгов, остальным участникам будет возмещен в течение 5(пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов в любое время, но не позднее чем за три дня до даты их проведения.

**Победитель (Претендент на покупку)** возмещает затраты и стоимость услуг на организацию и проведение торгов не позднее 3(трех) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов в соответствии с соглашением о правах и обязанностях сторон в размере 3% от начальной цены продажи.

**Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

■ Захоўваць заўжды

# Іспыт на галоўнай сцэне

**Ці бачылі вы, як на Мазыршчыне выканаўцы народнага танца «Зайчык» скачуць цераз вілкі для гаршкоў? Ці чулі вы, як у Чачэрскім раёне танцуюць «Барыню» і адначасова расказваюць гледачам пра свае хатнія справы? Ці ведаеце вы, што парны танец «Сто адзін» у самым хуткім тэмпе здаўна выконваюць пад Барысавам?**



Шмат цікавага пра народныя танцы даведаліся гледачы незвычайнага канцэрта, які днямі адбыўся на галоўнай сцэне Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва. Справаздачнае выступленне наладзілі студэнты пад кіраўніцтвам вядомага этнахарэографа, даследчыка танцавальнай спадчыны Мікалая Козенкі *(на здымку)*. Як выкладчык, ён уважліва назіраў з залы за сваімі выхаванцамі, фіксаваў відэакамерай кожнае па. Такі відэазапіс спатрэбіцца, каб потым параўнаць студэнцкае выкананне танца з тым, як здаўна танцуюць у вёсцы.

Менавіта ў вёсках розных рэгіёнаў Беларусі былі сабраны гэтыя ўзоры танцавальнай і песеннай спадчыны. Студэнты неаднаразова бывалі там у экспедыцыях, пераймалі ад носьбітаў полькі, кадрылі, традыцыйныя песенныя і гульнявыя карагоды.

Акадэмічны канцэрт-справаздача супаў для маладых этнолагаў і фальклярыстаў з самым адказным часам: зараз падводзяць вынікі іх вучобы, і праз некалькі месяцаў яны атрымаюць дыпломы. Веды народнай спадчыны і павага да яе назаўжды застануцца для іх бясцэнным здабыткам.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.07 | 16.51 | 7.44 |
| Віцебск — | 9.04 | 16.33 | 7.29 |
| Магілёў — | 8.57 | 16.41 | 7.44 |
| Гомель — | 8.46 | 16.45 | 7.59 |
| Гродна — | 9.21 | 17.08 | 7.47 |
| Брэст — | 9.14 | 17.16 | 8.02 |

**Месяц**

***Апошняя квадра ў 9.40. Месяц у сузор'і Дзевы.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Ганны, Таццяны, Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана.*
***К.*** *Клаўдзіі, Францішка.*

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

## ЗАЎТРА




ПРОДАЁМ
СЕТКА-РАБИЦА от производителя – 134 900 рублей;
ТЕПЛИЦА 3 410 000 рублей;
СТОЛБЫ 62 000 рублей;
ПРОФИЛЬНЫЕ ТРУБЫ, ВОРОТА, ПРОФЛИСТ, БЕСЕДКИ
Консультация по телефонам: +375 33 311 66 71, +375 29 947 19 44.
БЫТОВКА МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 12 960 000 рублей;
АРМАТУРА, КАЛИТКИ, КРОВАТЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ, ПОСТЕЛЬНОЕ БЕЛЬЕ, ДВЕРЬ МЕТАЛЛИЧЕСКАЯ 1 350 000 рублей
ДОСТАВКА БЕСПЛАТНАЯ! В течение 2–5 дней
УНП 391802438

Утерянную печать индивидуального предпринимателя Литягевича Сергея Петровича (УНП 192351928) считать недействительной.

■ Чулі?

## У ЗІМОВУЮ КАЗКУ — НА СВЯТОЧНЫМ ЭКСПРЭСЕ

**«Навагодні экспрэс» Дзіцячай чыгункі прыме першых пасажыраў 24 снежня ў Мінску, паведамілі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі.**

Святочны цягнік будзе курсіраваць ў дні зімовых канікул, калядных і навагодніх свят — па 7 студзеня. Першы ў гэтым сезоне «Навагодні экспрэс» пад кіраўніцтвам юных чыгуначнікаў адправіцца з перона станцыі Заслонава 24 снежня ў 10.30. Дзіцячая чыгунка запрашае мінчан і гасцей сталіцы здзейсніць незабыўнае падарожжа па заснежаным лесе. Сёлета сумесна з Мінскім палацам культуры і спорту чыгуначнікаў традыцыйна на станцыі Сасновы Бор будзе арганізавана тэатралізаванае шоу з удзелам казачных герояў, Дзеда Мароза і Снягуркі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

СЕТЬ МАГАЗИНОВ КРОНОС ПРЯМЫХ ПОСТАВОК
НАШИ МАГАЗИНЫ:
• г. МИНСК, ул. Боровая, 1 Территория ТВЦ "Аквабел"
• Брестская обл., д. Пески-1 (трасса М1-Е30)
ЗВОНИТЕ ПРЯМО СЕЙЧАС!
+375 (33) 391 96 30
+375 (44) 712 12 03
НАДОЕЛО НАНИМАТЬ ТРАКТОР, ПРОСИТЬ, ПЛАТИТЬ, ПОДСТРАИВАТЬСЯ?
ЕСТЬ ОТЛИЧНОЕ РЕШЕНИЕ ПРОБЛЕМ!
КЕНТАВР Т-15 РЕСТАЙЛИНГ
+3 ПОДАРКА
+ ПРИЦЕП
+ ПЛУГ
+ ФРЕЗА
• Японский дизельный двигатель КАМА
• Водяное охлаждение
• Блокировка дифференциала
• Электростартер
• Восьмиступенчатая коробка передач
• Регулируемая колея
KRONOS5.BY
6 ПРИЧИН КУПИТЬ В КРОНОС
100% гарантия возврата денег
Цена от первого поставщика
Выездной сервисный центр
Быстрый кредит по телефону
Предпродажная подготовка
Бесплатная доставка до порога
СВИД. ВЫДАНО МИНСКИМ РАЙИСПОЛКОМОМ 6.11.2014 г. ООО "ФАРАНЕЙ" УНП 192372716

■ Ну і ну!

## ФУТБОЛ НЕ ПАДАБАЕЦЦА? СПЫНІМ!

**Лідар Маўрытаніі Махамед ульд Абдэль Азіз наведаў матч за Суперкубак краіны па футболе паміж камандамі «Тэўраг-Зэйна» і «Ксар».**

Пасля перапынку прэзідэнт яўна засумаваў і на 63-й хвіліне загадаў спыніць паядынак і загадзя прабіць серыю 11-метровых удараў. У выніку перамогу атрымаў «Тэўраг-Зэйна». Рашэнне было прынята пасля перамоў з трэнерамі і прэзідэнтамі клубаў.

**Якаў ЖУРБІН.**

## УСМІХНЕМСЯ

**З назіранняў халасцяка.**

**Ад жанчын велізарная карысць, нават калі яны абяцаюць і не прыходзяць: зубы пачышчаны, гладка паголены і спіш на свежых прасцінах! Плюс добрае віно, шакалад і садавіна! Ну і парадак у доме.**

Хацела спаць. Выпіла моцнай кавы. Па-ранейшаму хачу спаць, але ўжо больш энергічна.

**— Дарагая, налі кампоту! Не бачыш, як мне дрэнна?..**

**— Табе якога кампоту, персікавага ці вішнёвага?**

**— А-гур-ко-ва-га!**

Юныя карыстальнікі інтэрнэту ў шоку: яны даведаліся, што лайкі — гэта сабакі!

**— У вас ёсць шампунь?**

**— Так. Для якога тыпу валасоў?**

**— Для брудных.**

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.035. Індэкс 63850. Зак. № 4667.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 снежня 2015 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12